
Фота БЕЛТА.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СТУДЗЕНЯ 2007 г. СУБОТА
№ 13 (25878)
Кошт 350 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.
Наша газета ўключана ў «Залаты фонд прэсы» СНД

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ЭКАНОМІЯ — ВАЖНЕЙШАЯ ЎМОВА ЎМАЦАВАННЯ ЭКАНАМІЧНАЙ БЯСПЕКІ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ БЕЛАРУСІ»

**У Беларусі будзе арганізаваны выпуск поўнай наменклатуры бытавой тэхнікі. Канкрэтным крокам для выканання гэтай маштабнай задачы з'яўляецца ўвод у строй завода бытавой тэхнікі ЗАТ «Атлант», заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці прадпрыемства.**

Паводле яго слоў, вырашэнне гэтай задачы будзе мець двайны эфект. Па-першае, насыціць унутраны рынак Беларусі прадукцыяй, якая карыстаецца попытам і якую цяпер краіна вымушана імпартаваць, затрачваючы на гэта немалыя валютныя рэсурсы. «Больш танная айчынная тэхніка дасць эканомію фінансаў не толькі дзяржаве, але і беларускім сем'ям», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Па-другое, дадаў ён, выпуск у Беларусі ўсяго комплексу неабходнай чалавеку тэхнікі дасць магчымасць выйсці з новым асартыментам на знешнія рынкі, тым самым павялічыць экспартны патэнцыял краіны і дасць дадатковую крыніцу паступлення валюты.

Новыя ўмовы гаспадарання, у якіх апынулася Беларусь, выстаўляюць да эканомікі краіны больш высокія патрабаванні.

Паводле слоў Прэзідэнта, на першы план у рабоце эканомікі выходзіць беражлівасць, уменне эканоміць, атрымліваць як мага большы вынік пры найменшым расходаванні матэрыяльных сродкаў. «Гэта важнейшая ўмова рэалізацыі ўсіх нашых планаў, гэта пытанне ўмацавання эканамічнай бяспекі і незалежнасці нашай краіны», — падкрэсліў беларускі лідар.

Нягледзячы на абставіны, Беларусь не мае намеру збаўляць тэмпы развіцця эканомікі.

У гэтай пяцігодцы ў краіне плануецца пабудаваць каля 300 новых вытворчасцяў і прадпрыемстваў. Будуць таксама мадэрнізаваны і пераасначшаны некалькі соцень дзеючых прадпрыемстваў. «Гэта будзе зусім новая эканоміка, арыентаваная ў першую чаргу на перапрацоўку айчыннай сыравіны, на максімальнае імпартазамяшчэнне і эканомію энергарэсурсаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён адзначыў, што ўвядзенне ў строй новага прадпрыемства — завода бытавой тэхнікі ЗАТ «Атлант» — сведчанне таго, што эканоміка нашай краіны набрала абароты.

«Нам трэба ўзварухнуцца, перастаць ныць, разумеючы, што таннага газу і нафты нам ніхто не дасць, нават самыя блізкія краіны. Але гэта не значыць, што кіраўніцтва перастане змагацца за больш танныя энергарэсурсы, камплектуючыя», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы ў час гутаркі з работнікамі ЗАТ «Атлант».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў: беларусы павінны разумець, што разлічваць яны могуць, перш за ўсё на сябе. Разам з тым, паводле слоў Прэзідэнта, кіраўніцтва краіны «ў бядзе народ не пакіне».

«Мы будзем рабіць усё, каб ствараць аптымальныя ўмовы для народа», — сказаў беларускі лідар.

У бліжэйшыя пяць гадоў на ЗАТ «Атлант» будуць выпускаць да 1 млн. пральных машын у год.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што прадпрыемства дасягне гэтай мэты. Паводле яго слоў, ужо сёлета на заводзе намечана асваенне 6 з 19 мадэляў пральных машын пры агульным аб'ёме выпуску 150 тыс. адзінак.

Толькі за мінулыя 5 гадоў гадавы аб'ём вытворчасці на прадпрыемстве практычна падвоіўся і перасягнуў $400 млн. Экспарт прадукцыі, які ў агульным аб'ёме вытворчасці складае 70 працэнтаў, вырас амаль у 2 разы.

Прэзідэнт выказаў надзею, што працоўны калектыў «Атланта» не спыніцца на дасягнутым, а будзе працаваць яшчэ больш эфектыўна. «Тым больш што да гэтага нас падштурхоўваюць час, сітуацыя, што складваецца ў эканоміцы краіны, новыя ўмовы гаспадарання, у якіх апынулася Беларусь», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Беларусі лічыць 2006 год асабліва паспяховым у рэалізацыі буйных інвестыцыйных праектаў.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, аб'ём капіталаўкладанняў у рэальны сектар эканомікі ў 2006 годзе павялічыўся амаль на трэць у параўнанні з папярэднім годам. Прытым характэрна, падкрэсліў ён, што асноўнай крыніцай інвестыцый сталі сродкі саміх прадпрыемстваў. Як адзначыў Прэзідэнт, менавіта ў гэтым плане асаблівую каштоўнасць і значнасць мае вопыт ЗАТ «Атлант». Прэзідэнт Беларусі высока ацаніў работу ЗАТ «Атлант» па энергазберажэнню і павышэнню эфектыўнасці вытворчасці.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, за апошняе дзесяцігоддзе на прадпрыемстве больш як у 4 разы зніжана ўдзельная вага паліўна-энергетычных рэсурсаў у сабекошце прадукцыі. Па электраспажыванню халадзільнікі і пральныя машыны, што выпускаюцца на прадпрыемстве, адпавядаюць высокім сусветным стандартам.

Прэзідэнт дадаў, што разумная кааперацыя ЗАТ «Атлант» з іншымі прадпрыемствамі, размяшчэнне вытворчасцяў у малых гарадах краіны таксама важны фактар поспеху. Беларусь павінна падвоіць выпуск прадукцыі, запатрабаванай як унутры рэспублікі, так і за мяжой.

Неабходна больш актыўна ствараць новыя вытворчасцяў шляхам выкарыстання плошчаў, якія пустуюць, і прымацавання стратных вытворчасцей да буйных стабільных прадпрыемстваў.

«Калі за 3-4 гады мы выстаім, вытрымаем, то ў нас будзе незатратная эканоміка, у нас усё будзе пралічана», — дадаў Прэзідэнт.

Прэзідэнт Беларусі заявіў, што за бягучую пяцігодку неабходна задзейнічаць усе недабудаваныя будынкі, перш за ўсё, у вытворчай сферы.

«Да канца пяцігодкі такіх недабудаваных будынкаў быць не павінна. Усё павінна быць аддадзена або прададзена прыватніку. Няхай людзі працуюць, усё трэба распісаць. Камітэту Дзяржкантролю ўзяць гэта пытанне пад строгі кантроль», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

«Інвестарам трэба паставіць задачу: мы аддаём будынак, але да канца пяцігодкі тэрыторыю трэба прывесці ў парадак», — дадаў Прэзідэнт. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, тыя недабудаваныя будынкі, якія немагчыма будзе прадаць або перадаць прыватніку, трэба будзе знесці, а зямлю — эфектыўна выкарыстоўваць. «Попыт на зямлю сёння вялікі», — канстатаваў беларускі лідар.

На памяць аб наведванні завода бытавой тэхнікі Аляксандру Лукашэнку падарылі пральную машыну, якую кіраўнік дзяржавы распарадзіўся перадаць у адзін з дзіцячых дамоў Беларусі.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## НА МІНСКАЙ ІЯРДАНІ


*Айцец Сергій — святар Свята-Елісавецінскага праваслаўнага манастыра ў Мінску перад вадохрышчанскім купаннем у Камсамольскім возеры.*
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## У. КАНАПЛЁЎ: «Вынікам сустрэчы ў Мінску са старшынёй ПАСЕ стала тое, што бакі навучыліся слухаць адзін аднаго»

**Галоўным вынікам сустрэчы са старшынёй Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы з'яўляецца тое, што бакі «навучыліся слухаць адзін аднаго і не спрачацца, а проста дыскутаваць па асобных пытаннях». Аб гэтым журналістам у Мінску заявіў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Канаплёў.**

Ён адзначыў, што пытанні, якія былі ўзняты на сустрэчы са старшынёй ПАСЕ, не з'яўляюцца новымі для беларускага боку. Яны абмяркоўваліся і раней, і па многіх з іх у Беларусі і ПАСЕ розныя пункты гледжання. Менавіта аб гэтым, паводле слоў Уладзіміра Канаплёва, ён расказаў свайму калегу. Спікер ніжняй палаты беларускага парламента таксама выказаў думку аб тым, што на сённяшні дзень няма ніякіх падстаў для таго, каб Беларусь не мела статусу спецыяльна запрошанай дзяржавы ў ПАСЕ або «хоць бы не працавала ў тых рамках, у якіх працавала да 2003 года». Уладзімір Канаплёў адзначыў, што бакі «пазначылі сабе ўсе спрэчныя пытанні і маюць намер абмяркоўваць іх у будучым». У сваю чаргу, старшыня ПАСЕ Рэнэ ван дэр Ліндэн падкрэсліў, што сённяшняя дыскусія была «дастаткова шчырая». Ён расказаў адкрыта аб пазіцыях Савета Еўропы па сітуацыі ў Беларусі, выказаў надзею, што гэта сустрэча «дасць магчымасць адкрыць дыялог паміж Беларуссю і ПАСЕ па пытаннях еўрапейскіх каштоўнасцяў і іх імплементацыі» ў нашай рэспубліцы ў будучым. Старшыня ПАСЕ таксама паведаміў, што ён «папрасіў беларускі бок зрабіць крокі, якія сведчылі б аб яе жаданні наблізіцца да Савета Еўропы».

**Марыя ГУЦАЛА, БЕЛТА.**

## Сустрэча са старшынёй ПАСЕ

**Візіт старшыні ПАСЕ Рэне ван дэр Ліндэна можа стаць добрым пачаткам дыялогу паміж Беларуссю і Еўропай. Такую думку выказаў учора старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Генадзь Навіцкі.**

Г. Навіцкі таксама выказаўся аб неабходнасці ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і еўрапейскімі структурамі, а таксама Еўропай у цэлым. Паводле яго слоў, знаёмства Рэне ван дэр Ліндэна з рознымі аспектамі жыцця нашай краіны створыць добрыя перадумовы для такога ўзаемадзеяння. А ад узаемаразумення да згоды — адзін крок, падкрэсліў Г. Навіцкі. Са свайго боку старшыня ПАСЕ выказаў упэўненасць, што беларускі бок сапраўды зацікаўлены ў супрацоўніцтве з Еўропай. А таксама ў тым, што праз некаторы час Беларусь усё ж такі стане членам Савета Еўропы. Пры гэтым Р. ван дэр Ліндэн адзначыў, што, на яго думку, пасля рознагалоссяў з Расіяй наша краіна адчула большае разуменне неабходнасці стаць бліжэй да Еўропы. Паводле яго слоў, вельмі важна, каб усе краіны Еўропы раздзялялі каштоўнасці Савета Еўропы.

* * *

Адна з асаблівасцяў візіту старшыні ПАСЕ заключаецца ў тым, што ён прыехаў у Беларусь не патрабаваць выканання нейкіх умоў. Ён адзначыў, што займае нейтральную пазіцыю і не жадае маніпуляваць думкамі. Візіт у Беларусь — жаданне паказаць гатоўнасць еўрапейскіх структур да вядзення дыялогу. Р. ван дэр Ліндэн адзначыў, што беларускі бок таксама паказваў жаданне весці такі дыялог.

Першы візіт Р. Ван дэр Ліндэна ў Беларусь можна назваць у нечым азнаямляльным. Р. Ван дэр Ліндэн таксама адзначыў, што было б добра, каб узаемаадносіны Беларусі і ПАСЕ не абмежаваліся толькі адным візітам. Што ж датычыцца гэтага візіту, то, адзначыў старшыня ПАСЕ, усе ўмовы па ім беларускім бокам былі выкананы.

**Сяргей КАРАЛЕВІЧ.**

## Расія зніжае экспартную пошліну на нафту на $1

Пошліны на экспарт нафты і нафтапрадуктаў з Расіі з 1 лютага 2007 года знізяцца. Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Расіі. Вывазная мытная пошліна на нафту з 1 лютага зніжаецца з $180,7 за тону да $179,7. Змяненне пошлін звязана са зніжэннем сусветных цэн на нафту.

**Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.**

### ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

22 студзеня 2007 г. у 15.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне шостай пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ ДА 8 МАРОЗУ І СНЕГ

**Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава, у большай частцы Беларусі 20 студзеня ападкаў ужо не будзе, аднак у другой палове дня снег і мокры снег будзе назірацца ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях.**

У параўнанні з пятніцай, у суботу вецер часова аслабее. На дарогах будзе моцная галалёдзіца. Тэмпература паветра ад 3 марозу да 2 цяпла, па паўднёваму захаду да плюс 5 градусаў.

У нядзелю чарговы цыклон з Атлантыкі прынясе да нас мокры снег, а потым дождж. Пададзе рэзкі паўднёва-заходні вецер, хуткасць якога будзе дасягаць 15—20 м/сек. Тэмпература паветра ў працягу сутак ад 0 да 6 цяпла, толькі ўначы на ўсходзе краіны да 3 марозу. Аднак ужо на наступным тыдні да нас завітае зіма. Пойдзе сапраўдны снег. Тэмпература паветра да аўторка знізіцца ўначы да мінус 2—8 градусаў, удзень 0—5 марозу. Сіноптыкі зноў нагадваюць, што ў нядзелю захоўваецца штармавая небяспека. Будзьце ўважлівыя і асцярожныя.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ДАІ ГАТОВА ПРЫЙСЦІ НА ДАПАМОГУ

**У сувязі з аб'яўленнем штармавога папярэджання супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі будуць несці службу ва ўзмоцненым рэжыме.**

Як паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні ДАІ МУС краіны, у выхадныя дні на працоўных месцах будзе практычна ўвесь асабовы састаў Дзяржаўтаінспекцыі. На аўтамагістралях павялічана колькасць патрулёў. Сумесна з дарожнымі службамі створаны аварыйна-выратавальныя брыгады. Дзяржаўтаінспекцыя таксама просіць паведамляць **па тэлефоне ў Мінску 218-76-35** любую інфармацыю аб здарэннях на дарогах, завалах, абвалах і іншых пашкоджаннях аўтамагістралей.

Вадзіцелям Дзяржаўтаінспекцыя рэкамендуе ўстрымацца ад паездак у «штармавыя» дні і не паркаваць аўтамабілі паблізу дрэў і збудаванняў, якія могуць не вытрымаць націску стыхіі. А тым, хто ўсё ж не зможа адкласці паездку, варта праявіць асцярожнасць: зменшыць хуткасць, павялічыць дыстанцыю, не рабіць рэзкіх манеўраў і быць асабліва пільнымі ў месцах, дзе могуць з'явіцца пешаходы. Апошнія павінны памятаць, што ў цёмны час сутак на дарозе трэба абавязкова абазначыць сябе святлоадбівальным элементам — флікерам.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ВЕЦЕР НАРАБІЎ БЯДЫ

**Ураганны вецер, які бушаваў у ноч на пятніцу і ўвесь наступны дзень, нарабіў бяды на Брэстчыне. У абласным цэнтры паваленa некалькі дрэў. У двары дома № 65/3 па вуліцы Суворава бурай зламала дзве таполі, пад адной з іх аказаўся чалавек. Мужчына 1979 года нараджэння дастаўлены ў бальніцу з траўмай пазваночніка. Урачы ацэньваюць яго стан як здавальняючы.**

Па стану на 15 гадзін учарашняга дня ў прэс-службе абласнога ўпраўлення МНС валодалі звесткамі аб пашкоджанні лініі электраперадач у 41 населеным пункце васьмі раёнаў вобласці. Найбольш пацярпелі Камянецкі і Пружанскі раёны.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### РВАЛІСЯ ПРАВАДЫ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

**Менавіта ў гэтай вобласці, як паведаміў карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар МНС Віталь Навіцкі, учора больш за ўсё было адключэнняў падачы электраэнергіі з-за лютаваўшага тут ветру.**

Паводле даных, якімі валодалі ў міністэрстве ўчора днём, у выніку стыхіі пацярпелі 602 населеныя пункты. Прычым у большасці з іх — у 579 — асноўнай праблемай стала спыненне падачы электраэнергіі. Напрыклад, у Віцебскай вобласці вецер пашкодзіў больш за 13 кіламетраў лініі электраперадач. Тут больш за ўсё пацярпела і населеных пунктаў — 365. У Гродзенскай вобласці такіх налічвалася 88, у Мінскай — 57, у Брэсцкай — 40. Менш за ўсё стыхія нарабіла бяды ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях, дзе ў лік нешчаслівых трапілі 21 і 8 населеных пунктаў адпаведна. Па ўсёй рэспубліцы было пашкоджана 8 дамоў і 30 сельскагаспадарчых будынкаў. На шчасце, у выніку разгулу непагадзі чалавечых ахвяраў не зафіксавана. На ліквідацыю наступстваў моцнага ветру было прыцягнута 800 чалавек і больш за 200 адзінак тэхнікі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### ВЕЦЕР «УДАРЫЎ» ПА КАРОВАХ

**70 галоў жывёлы давялося ўчора эвакуіраваць з фермы ў Клецкім раёне. Сельскагаспадарчы будынак моцна пацярпеў ад ветру, у прыватнасці, яго дах.**

Усяго моцным ветрам на Міншчыне былі пашкоджаны дахі прыкладна 20 жылых дамоў і сельскагаспадарчых будынкаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### НАСЕЛЬНІЦТВУ БУДУЦЬ КАМПЕНСАВАНЫ СТРАХАВЫЯ ЎЗНОСЫ...

**У гэтым годзе міністэрства фінансаў вызначыць пытанне, якім чынам будуць кампенсавацца насельніцтву страхавыя ўзносы, што былі ўнесены па дагаворах заключаных да 1992 года, паведаміла намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення страхавога нагляду Мінфіна Беларусі Наталля Халітава.**

Паводле слоў спецыяліста, пакуль невядома, у якіх аб'ёмах будуць ажыццяўляцца кампенсацыі. Вядома, што да 1992 года дагаворы страхавання заключылі каля 1,5—2 мільёнаў чалавек. Аднак кампенсацыя па іх будзе адназначна праводзіцца з улікам інфляцыі і дэнамінацыі. Колькі спатрэбіцца сродкаў на кампенсацыю страхавых узносаў, на які перыяд расцягнецца гэты працэс, хто ў першую чаргу атрымае гэта права, — гэтыя пытанні зараз прапрацоўваюцца спецыялістамі.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## НОВЫЯ АЎТОБУСЫ — ТОЛЬКІ ПАЧАТАК АБНАЎЛЕННЯ ТРАНСПАРТНЫХ ПАРКАЎ...

ЗЯМЛЯ І ЛЮДЗІ МІНШЧЫНЫ

**У чацвер жыхары Нясвіжа на працягу дня бясплатна карысталіся паслугамі грамадскага аўтатранспарту. Гэта стала магчымым з нагоды ўручэння рэгіёнам Міншчыны 42 беларускіх МАЗаў і «Радзімічаў». Падарункі на гэтым не скончыліся — сёлета больш за 200 адзінак аўтатранспартных сродкаў будзе накіравана ў арганізацыі Міншчыны. Столькі ж, а можа і больш запланавана набыць і ў будучым, 2008 годзе. Паводле слоў старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалая ДАМАШКЕВІЧА, пытанне паляпшэння абслугоўвання гарадскіх і сельскіх пасажыраў уваходзіла ў выбарчыя праграмы кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Саветаў. Зараз абяцанні народных выбраннікаў пачалі выконвацца.**



*Старшыня Мінскага аблвыканкама Мікалай ДАМАШКЕВІЧ уручае ключы ад новага аўтобуса вадзіцелю Аляксандру ЛУКАШЭВІЧУ.*

Генеральны дырэктар РУП «Мінскаблаўтатранс» Віктар Русак паведаміў, што ў вобласці ў абнаўленні маюць патрэбу 54 працэнты ад усёй колькасці парка грамадскага транспарту. Аднак гэтая праблема пачала вырашацца:

— Праз год—два дзяржаўны грамадскі аўтатранспарт вобласці будзе цалкам канкурэнтаздольны. Як бачым, ужо зараз мы набываем новую тэхніку, паляпшаем абслугоўванне людзей. Усе сацыяльныя стандарты ў гэтай сферы выконваюцца. 42 новыя аўтобусы вытворчасці Мінскага аўтамабільнага і Гомельскага аўтарамонтнага заводаў адпавядаюць экалагічным нормам Еўра-3, яны развіваюць хуткасць да 130 кіламетраў у гадзіну. А рухавікі МАЗаў і іншае іх абсталяванне — вытворчасці германскага «Мерсэдэса». Таму камфорт і прыемныя пачуцці пасажырам гарантаваныя.

На набыццё новых аўтобусаў, якія пойдуць у 18 рэгіёнаў Міншчыны, выдаткавана 6 мільярдаў рублёў. А ўсяго Мінскі аблвыканкам накіруе на набыццё і капітальны рамонт пасажырскіх аўтобусаў 24 мільярды рублёў. Будзе выканана ў поўным аб'ёме і праграма па набыццю аўтобусаў для школ вобласці.

Мікалай Дамашкевіч адзначыў, што ўручэнне новага аўтатранспарту менавіта ў Нясвіжы адбылося невыпадкова. «Нясвіж — горад старажытнай гісторыі, турыстаў тут заўсёды шмат. І мы жадаем, каб сюды завітвала яшчэ больш вандроўнікаў, таму няхай усе ведаюць, што грамадскі транспарт у Нясвіжы на ўзроўні, — адзначыў ён. — Супадзенне гэта ці не, але летась мы ўручалі аўтобусы ў Барысаве. І за мінулы год прыбыткі ад турыстычных паслуг павялічыліся там на чвэрць».

Разам з тым старшыня Мінскага аблвыканкама падкрэсліў: набыццё новых аўтобусаў з'яўляецца доказам таго, што Міншчына, нягледзячы на змяненне кошту на энергарэсурсы, не збіраецца пераглядваць праграмы свайго развіцця:


Фота БЕЛТА.

— Усе задачы, якія мы запланавалі на 2007 год, застануцца без змяненняў. Міншчына мае добрыя рэсурсы і рэзервы, таму будзем працаваць з большай энергіяй. Набыццё аўтобусаў — пачатак добры, і таму ўсё атрымаецца, трэба толькі не спыняцца на дасягнутым.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

### АВАРЫЯ Ў КАЦЕЛЬНІ

У кацельні бярозаўскага завода «Цеплапрыбор» узарваўся кацёл КТС-80, які працуе на цвёрдым паліве. На жаль, пацярпеў і чалавек. Качагар, што абслугоўваў агрэгат, атрымаў апёкі твару і тулава. Мужчына быў дастаўлены ў рэанімацыю.

**Яна СВЕТАВА.**

### МІЛІЦЫЯНЕР — ХАБАРНІК?

**Абвінавачанне ў атрыманні хабару прад'яўлена начальніку аддзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі Клімавіцкага раённага аддзела міліцыі. Яго затрымалі супрацоўнікі ўпраўлення ўласнай бяспекі Магілёўскага абласнога УУС.**

Паводле слоў намесніка пракурора Магілёўскай вобласці Аляксандра Матулькова, за хабар у памеры каля тысячы долараў затрыманы браўся станоўча вырашыць пытанне па незаконнаму вывазу за межы краіны лому каляровых металаў.

**Ілона ІВАНОВА.**

### РЫСЬ БЫЛА ХВОРАЯ НА ШАЛЕНСТВА

**Рысь, якая напала на жыхара Брагіна, была хворая на шаленства.**

17 студзеня ў прыгарадзе Брагіна ўпершыню быў зарэгістраваны выпадак з'яўлення рысі, якая напала на 40-гадовага мясцовага жыхара. Мужчына атрымаў нязначныя траўмы, і пасля аказання медыцынскай дапамогі быў адпушчаны дадому. Супрацоўнікам міліцыі ўдалося знайсці рысь у адным з двароў раённага цэнтра, дзе яна і была застрэлена.

**Алена САФРОНАВА, БЕЛТА.**

## Пачаўся мусульманскі новы год

**Мусульмане Беларусі і ўсяго свету святкуюць надыход новага, 1428 года па ісламскім календары.**

Як паведаміў старшыня Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Беларусі муфцій Абу-Бекір Шабановіч, у гэту ноч па мусульманскім календары адзначаецца дзень хіджры — перасялення прарока Мухамеда з Мекі ў Медзіну, якое стала пачаткам сусветнай ісламскай місіі. Надыходу новага года папярэднічаюць пятнічная малітва і ўрачыстая пропаведзь мулы.

Месяцавы мусульманскі год працягваецца 354 дні і падзяляецца на 12 месяцаў. Кожны няцотны месяц месяцавага года мае 30 дзён, а цотны — 29. Кожны трэці год мусульманскага месяцавага календара — высакосны (355 дзён). Паколькі год па месяцавым календары карацей за сонечны, час яго надыходу штогод змяшчаецца. Сёння ўсе мусульманскія краіны жывуць па агульнапрынятым хрысціянскім календары, а па месяцаваму летазлічэнню вызначаюць толькі асноўныя падзеі ў рэлігійным жыцці.

**Уладзімір ВАСІЛЬКОЎ, БЕЛТА.**

Глядзіце!

## ФОКУСЫ-ПОКУСЫ І НЕЧАКАНЫЯ АМПЛУА

Сёння на АНТ — першы выпуск рэаліці-шоу «Зорны цырк»

**Зараз іх роўна тузін: 6 мужчын і 6 жанчын, 6 ужо сфарміраваных «зорак» (тэлевядучыя і артысты) і 6 невядомых шырокай публіцы людзей. Крыху больш як месяц таму яны змянілі звыклы расклад жыцця на жорсткі рытм трэніровак, а звыклыя касцюмы — на практычна аднолькавую ўніформу ўдзельніка рэаліці-шоу. Пераможцам будзе названы толькі адзін з гэтых дванаццаці, але, на маю асабістую думку, кожны з іх ужо трыумфатар — таму, што ўвогуле адважыўся на 4 месяцы «выпасці» з работы і сям'і; таму, што не пабаяўся паказаць сябе (і не толькі поспехі, але і няўдачы) на ўсю краіну. А яшчэ таму, што ўдзельнікі «Зорнага цырка» падораць гледачам атмасферу дзяцінства і прыклады сапраўднай дарослай мужнасці, пераадолення сябе...**

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
*Разам з Наталляй РАДЗІНАЙ на манеж выйшаў цэлы заапарк: сабакі, мядзведзь, страус, паўлін і свойскія птушкі.*

ISSN 1990-763X
9771990763008

КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 140,00 |
| 1 еўра | 2 774,83 |
| 1 латвійскі лат | 3 978,80 |
| 1 літоўскі літ | 803,60 |
| 1 чэшская крона | 99,87 |
| 1 польскі злоты | 721,02 |
| 1 расійскі рубель | 80,73 |
| 1 украінская грыўня | 422,72 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 26,5075 |
| 10 UAH | 52,4050 |
| 1000 BYR | 12,3701 |
| EUR | 34,4173 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.01.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2210 / 2320 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

Надзвычайнае здарэнне

# Па-мужчынску!

**Хоць сёлетняя зіма ну зусім неспрыяльная для аматараў пакатацца на лыжах або санках, праляцець віхурай па азёрнаму лёду на каньках, гэта ніколькі не азначае, што зрабіць падобнае не хочацца. Асабліва хлапчукам-падлеткам, як сказаў паэт, не сядзіцца дома. А калі тут яшчэ ды канікулы — дык толькі на прыроду, дзе можна весела пагуляць.**

Менавіта з такім настроем і памкненнямі браты Мікіта і Саша Грамыкі, васьмі і дзевяці гадоў адпаведна, прыйшлі да свайго дзядулі, які жыў у Добрушы ў іншым мікрараёне. Яшчэ б: каля дзядулевага шматпавярховіка — азярына, якая, нягледзячы на цёплае надвор'е, з мінулых невялікіх маразоў была пакрытая лёдам. Малодшаму Мікіту захацелася пакоўзацца па ім, што ён і пачаў рабіць. Усё нармальна: лёд трымае. Вытрымае ён і далей, падумаў хлапчук і рушыў на другі бок азярыны.

Неабачлівасць Мікіты тут жа была пакараная: ён апынуўся ў вадзе, пачаў крычаць аб дапамозе. Трое хлапчукоў, што гулялі на беразе, спалохаліся і пабеглі клікаць дарослых, а Саша кінуўся да брата. І таксама праваліўся пад лёд.

Невядома, чым бы ўсё скончылася, калі б гэта не ўбачыў з акна сваёй кватэры, якая знаходзілася на сёмым паверсе, чатырнаццацігадовы Максім Талкачоў, васьмікласнік сярэдняй агульнаадукацыйнай школы № 3, які дапамагаў маці па дому. Не марудзячы ні хвіліны, ён схапіў з канапы пакрывала і пабег уніз, Людміла Іванаўна — услед за ім.

Тут трэба сказаць, што ў школьнай праграме ёсць такі прадмет, які называецца «Ахова і бяспека жыцця дзяцей» і што Максім з'яўляецца членам клуба «Юны выратавальнік» і неаднаразова ўдзельнічаў у раённых злётах юных выратавальнікаў-пажарнікаў. Таму ён дзейнічаў так, як яго і іншых школьнікаў вучыў выкладчык таго прадмета Аляксандр Іванавіч Пранузенка. Асцярожна наблізіўшыся да палонкі, ён падаў адзін канец пакрывала Мікіту, які ўжо страчваў сілы і ніяк не мог учапіцца за яго, паўтараючы: «Я не ўмею плаваць, выцягні мяне». Нарэшце гэта яму ўдалося, і ён апынуўся на беразе, а праз некалькі хвілін там ужо быў і Саша.

Людміла Іванаўна і Максім даставілі хлапчукоў да дзядулі, які жыў у тым доме, дзе і Талкачовы. Было гэта 26 снежня, і пэўны час мала хто ведаў аб гэтым здарэнні, якое магло закончыцца трагічна. Шырокую ж пагалоску яно атрымала пасля таго, як Людміла Іванаўна выпадкова сустрэла на вуліцы намесніка дырэктара школы па выхаваўчай рабоце Тамару Іванаўну Бястрыцкую і расказала ёй аб усім. У школе нядаўна прайшла лінейка, Максіма ўшанавалі падарункам і ставілі ў прыклад іншым вучням. У прысутнасці дырэктара школы Вольгі Уладзіміраўны Пархоменка і спецыяліста па выхаваўчай рабоце раённага аддзела адукацыі Людмілы Уладзіміраўны Яўтуховай я гутарыў з Максімам, які, не пабаюся гэтага слова, здзейсніў подзвіг.

— Максім, а калі б ты не меў тых навыкаў, якія атрымаў у клубе «Юны выратавальнік» і на ўроках , ці адважыўся б на тое, на што пайшоў?

— Абавязкова пайшоў бы. Саша і Мікіта былі ж у бядзе. Нічога асаблівага я не зрабіў. Проста дапамог.

У гэтым адказе ўвесь ён, сказала мне пасля Вольга Уладзіміраўна. Сціплы. Моцны. Прыгожы. Нікога ніколі не пакрыўдзіў. Заўсёды гатовы падтрымаць іншага. З простай рабочай сям'і, у якой бацькі прывучылі яго і старэйшага брата Дзяніса да працы, да дысцыпліны, прывілі ім пачуццё адказнасці за свае ўчынкі. Па большасці прадметаў у яго сямёркі—дзевяткі, а вось па беларускай і рускай мовах яму трэба падцягнуцца. Любіць фізкультуру і ахвотна займаецца валейболам і настольным тэнісам.

— Ведаеце, — расказвала пазней Людміла Іванаўна дырэктару школы, — што адчувала я, калі стаяла на беразе і думала: крый Божа, калі праваліцца лёд і пад Максімам — хто будзе выратоўваць дзяцей, усіх траіх, калі нікога з дарослых побач няма?

Добра, што ўсё абышлося. Максім, чатырнаццацігадовы васьмікласнік, засведчыў (таксама не пабаюся сказаць гэтыя словы) сваю грамадзянскую сталасць, а Саша і Мікіта Грамыкі, будзем спадзявацца, атрымалі ўрок на ўсё жыццё: перш чым нешта зрабіць, трэба як след падумаць. І яшчэ. Максіма Талкачова чакае ўзнагарода абласнога таварыства выратавання на водах.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**



Дыскусійная трыбуна

# КАНФЛІКТНАЯ ЭКАНОМІКА

**Аб апошнім канфлікце вакол паставак у Беларусь расійскіх нафты і газу, а таксама іх транзіту праз тэрыторыю рэспублікі карэспандэнт «Звязды» гутарыць з намеснікам старшыні Камісіі па бюджэту, фінансах і падатковай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам МАРАХІНЫМ і беларускім палітолагам Юрыем ШАЎЦОВЫМ.**

## Віктар МАРАХІН: «Кіраўніцтва Расіі будзе вымушана зрабіць крок назад»



**— Як вы ацэньваеце пагадненні, якія былі дасягнуты беларускім і расійскім бакамі па пытаннях аб паставах у Беларусь і транзіце праз тэрыторыю краіны расійскіх газу і нафты? Якія страты панясе Беларусь у 2007 годзе і ў наступныя некалькі гадоў?**

— Галоўнае тое, што бакам удалося дамовіцца. Самы благі мір лепш, чым самая добрая вайна. Бо ад гэтай сітуацыі цярпеў імідж і Расіі, і Беларусі.

Дзве краіны былі надзейнымі партнёрамі, якія ўжо дзесяцігоддзе ішлі насустрач адзін аднаму як незалежныя дзяржавы. Заставалася некалькі крокаў да адзінай Саюзнай дзяржавы. Але тут аказалася, што мы маем розныя падыходы да пытання аб яе стварэнні. І мы бачылі, што нафтагазавая вайна была хоць і кароткая, але вельмі агрэсіўная. І гэта не з лепшага боку характарызуе нашы адносіны. Таму першы станоўчы момант у тым, што ўдалося дамовіцца і Беларусь выйшла з крызісу з мінімальнымі стратамі.

Якія страты мы маем па газу? Спачатку было заключана пагадненне аб тым, што мы будзем працаваць у такіх жа ўмовах, як і пяты цэнавы пояс Расіі, як Смаленск. Гэта значыць сёлета газ у Беларусь павінен быў паступаць па цане 54—55 долараў за тысячу кубічных метраў. Аднак мы заключылі пагадненне аб цане ў 100 долараў.

Калі параўноўваць з тым, што з самага пачатку Расія прапаноўвала кошт у 200 долараў, то, канешне, мы маем значны поспех. Калі ж параўноўваць з тым, што павінен быў быць кошт у 54 долары, то мы маем дастаткова значныя страты для нашай эканомікі. Аднак цану газу трэба ўвязваць з ацэнкай «Белтрансгаза». Расія ацаніла гэтае прадпрыемства спачатку ў 800 млн, а затым у 1,2 млрд долараў, а Беларусь — у 5 млрд. У рэшце рэшт удалося дамовіцца аб продажы «Белтрансгаза» за 5 млрд. Таму пагадненні з расійскім бокам з'яўляюцца поспехам для Беларусі.

Мы павінны быць гатовыя працаваць у рынкавых умовах. Бо мы заўсёды лічылі, што сяброўства і братэрства не прадаюцца, аднак, аказваецца, яны маюць цану, якую вызначае наш стратэгічны партнёр — Расія. Мы разумеем, што Расія ўступае ў СГА. Беларусь таксама мае намер уступаць у гэтую арганізацыю, адной з умоў уступлення ў якую з'яўляецца пераход на рынкавыя цэны. Але дадзены пераход можна быць бязбольным. Напрыклад, Расія вызначыла, што расійскія прадпрыемствы выйдуць на ўзровень рынкавых цэн да 2011 года (па прыкладна 180 долараў за 1 тыс. кубічных метраў газу) і гэта будзе паступовы працэс. Так, сёлета па пятаму поясу Расіі кошт газу складае 55 долараў.

А для Беларусі — ужо 100. Такім чынам наша краіна мае дастаткова рэзкую нагрузку на эканоміку. У той жа час, калі параўнаць са сусветнымі цэнамі, то 100 долараў — гэта кошт, які задавальняе Беларусь. Хоць мы, згаджаючыся з гэтай цаной, разлічвалі, што не будзем несці ніякіх пошлін на нафту, якая ўвозіцца ў краіну з Расіі. Такая дамоўленасць была з расійскім бокам.

Першапачаткова Расія ўявяла пошліну ў памеры 180 долараў за тону нафты, аднак мы выйшлі на суму ў 53 долары. Канешне, гэта значны поспех і я думаю, што пры такіх цэнах беларуская эканоміка справіцца з пастаўленымі задачамі. Недзе, напэўна, давядзецца скарачаць нейкія расходы. Але, як заявіў Прэзідэнт нашай краіны, усё, што было вызначана ў бюджэце на сацыяльнае развіццё, адназначна застанецца... Мы будзем разлічваць на пераабсталяванне беларускіх прадпрыемстваў, на іх мадэрнізацыю. За кошт энергазберагальных тэхналогій мы павінны справіцца з задачамі, якія стаяць перад эканомікай.

**— Падчас расійска-беларускага крызісу, што ўзнік вакол паставак газу і нафты, у Беларусі не назіралася вялікай панікі сярод насельніцтва. Адзіным выключэннем сталі незначныя зрухі на валютным рынку. Чаму, на ваш погляд, насельніцтва так адрэагавала на сітуацыю?**

— Думаю, так адбылося дзякуючы Прэзідэнту Аляксандру Лукашэнку. Ён заявіў у сродках масавай інфармацыі, што ў нас павышэння цэн не будзе. І людзі ведаюць, што калі сказаў Прэзідэнт, то гэта будзе выканана любой цаной, людзі не пацерпяць. Таму і на запраўках не пачалі хаваць бензін, не пачалі знікаць нейкія віды паліва. У нас нармальна працавалі банкі...

**— Наколькі, на ваш погляд, рэальная версія, што падчас апошняга крызісу расійскае кіраўніцтва прапаноўвала кіраўніцтву Беларусі танныя энерганосьбіты ў абмен на максімальнае аб'яднанне дзвюх дзяржаў?**

— Думаю, такім чынам Расія магла паспрабаваць актывізаваць працэс уступлення адной дзяржавы ў іншую. Але гэта не стварэнне Саюзнай дзяржавы. Уступленне адной дзяржавы ў склад іншай было б вельмі негатыўнай справай для Беларусі і яе грамадзян, якія ўжо ведаюць, што такое суверэнітэт, што такое жыць у сваёй краіне, дзе няма вайны, дзе існуе стабільнасць, дзе няма масавых беспарадкаў... Рух можа быць толькі да саюза роўных дзяржаў, а не да паглынання адной дзяржавы іншай. І мы максімальна адстаялі свой суверэнітэт.

**— Ці можна, на ваш погляд, казаць пра тое, што сёння мы назіраем канец існавання Саюзнай дзяржавы?**

— Напэўна, канец існавання Саюзнай дзяржавы не наступіў. Зараз Расія проста перажывае чарговы этап палітычнай барацьбы ўнутры дзяржавы. Сёлета ў Расіі адбудуцца парламенцкія выбары, а ў пачатку наступнага года — прэзідэнцкія. І пэўныя палітычныя сілы, пэўныя фінансавыя дзялкі імкнуцца максімальна выкарыстоўваць гэты час для атрымання звышпрыбыткаў.

А простым расійскім грамадзянам, думаю, гэта не патрэбна. Ім трэба жыць у сяброўстве з братэрскім беларускім народам. Яны ведаюць, што Беларусь з'яўляецца надзейным саюзнікам, які ніколі не кідаў Расію. Простыя расіяне разумеюць, што адмаўляцца ад адзінага надзейнага саюзніка няварта. І я думаю, што і кіраўніцтва Расіі будзе вымушана зрабіць крок назад, крок да збліжэння нашых дзяржаў.

**— Ці можна чакаць, на ваш погляд, скарачэння палітычнай падтрымкі беларускага кіраўніцтва з боку расійскага кіраўніцтва (якая была вельмі моцнай апошняе дзесяцігоддзе, у прыватнасці, на міжнароднай арэне) пасля апошняга крызісу?**

— Беларусь таксама заўсёды была верным саюзнікам Расіі. У знешнепалітычнай дзейнасці мы адстойвалі ўзаемныя інтарэсы. Думаю, што такая сітуацыя захаваецца, нягледзячы на нафтагазавы крызіс, які быў. Я ўпэўнены, што, якія б зараз ні былі вострыя адносіны паміж краінамі, але крызіс пераадолены і намеціліся шляхі выраўноўвання адносінаў, шляхі па далейшаму збліжэнню краін. І на міжнароднай арэне мы маем адзіныя мэты і будзем працаваць разам.

## Юрый ШАЎЦОЎ: «Мы адстаялі большую частку сваіх эканамічных інтарэсаў»



**— Хто, на ваш погляд, прайграў, а хто выйграў падчас апошняга газавага і нафтавага канфлікту паміж Расіяй і Беларуссю?**

— Напэўна, выйграла Беларусь. Бо ініцыятарам канфлікту была Расія, расійскія мэты былі акрэслены. І гэтых мэтаў Расіі дасягнуць не ўдалося. Ні па газу, ні па нафце тых цэн, пра якія з спачатку ішла размова, няма. Цэны меншыя. Больш за тое, «Газпрам» спачатку ацэньваў «Белтрансгаз» у 600 млн долараў, а зараз ён пагадзіўся на кошт у 5 млрд.

Таму, калі глядзець на сітуацыю ў катэгорыях «хто перамог, а хто прайграў», то, думаю, мы перамаглі. Гэта не трыумф, але Беларусь засталася незалежнай краінай, мы адстаялі большую частку сваіх эканамічных інтарэсаў. І, што самае галоўнае, за час эканамічнай вайны мы, здаецца, здолелі палепшыць адносіны з Захадам. Гэта вельмі важна, бо ніводная краіна не можа радавацца, калі ў яе дрэнныя адносіны з суседзямі.

**— Некаторыя лічаць, што, мабыць, Расіі не ўдалося дасягнуць сваіх мэтаў з-за таго, што расійскае кіраўніцтва вырашыла не абрушваць эканоміку рэспублікі, бо першапачаткова прапанаваныя цэны беларуская эканоміка не магла б вытрымаць?**

— Не думаю. Напрыклад, сітуацыя вакол «Белтрансгаза» не мае адносінаў да таго, абрушыць эканоміку ці не. Давялося расійскаму боку пайсці на яго ацэнку ў 5 млрд і на беларускія ўмовы прыватызацыі — і ўсё... Мне падаецца, што няздольнасць расійскага боку дасягнуць сваіх мэтаў не з'яўляецца нейкай яго ўнутранай высакароднасцю ці жалем да беларускай эканомікі.

**— Вы сказалі, што падчас крызісу «Беларусь змагла застацца незалежнай». Такім чынам вы падзяляеце версію аб тым, што кіраўніцтва Расіі магло прапанаваць беларускаму кіраўніцтву танныя энерганосьбіты ў абмен на максімальнае аб'яднанне дзвюх краін?**

— Думаю, да гэтага ішло. Проста гэта не прагучала падчас дадзенай кампаніі так адкрыта, як было ў 2003 годзе. Тады мы мелі такую ж эканамічную вайну з Расіяй. Тады нават справа дайшла да газавай блакады Беларусі. І тады гучна было сказана пра тое, што Беларусь можа пазбавіцца ад усіх праблем, калі ўвойдзе ў склад Расіі... Хоць і зараз расійскія чыноўнікі казалі, што альбо вы будзеце часткай Расіі і тады ўсё будзеце атрымліваць па ўнутраных цэнах, альбо...

**— Як, на ваш погляд, беларускі электарат (а не палітычнае ці эканамічнае кіраўніцтва) ставіцца сёння да ідэі ўваходжання Беларусі ў склад Расіі?**

— Сацыялагічныя апытанні сведчаць, што прыхільнікаў такога кроку існуе вельмі невялікая колькасць.

**— Чаму, на ваш погляд, у беларускім грамадстве падчас апошняга расійска-беларускага канфлікту не назіралася значнай панікі (акрамя невялікіх зрухаў на валютным рынку)?**

— Вострая фаза крызісу цягнулася з пачатку снежня і больш чым за месяц была магчымасць упасці ў паніку. Аднак давер да дзяржавы вельмі шмат значыць. Да таго ж, мне падаецца, што людзі за апошнія 12 гадоў столькі разоў бачылі схваткі паміж Беларуссю і Расіяй, што ўжо прызвычаіліся да таго, што мы так ці інакш устаім.

**— Ці можна, на ваш погляд, сцвярджаць, што апошні крызіс прывёў да канца існавання Саюзнай дзяржавы?**

— Так, безумоўна. Як нейкі інстытут Саюзная дзяржава захоўваецца, яе не скасавалі. Але дамоўленасці і па нафце, і па газу сфармуляваны не ў катэгорыях, якія б базіраваліся на дагаворы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, а на іншых пунктах.

Так, цэны на газ зараз вылічваюцца па формуле, якая прывязвае іх да ўсходнееўрапейскіх цэн. Гэта значыць, што агульнай эканамічнай прасторы Саюзнай дзяржавы ў той частцы, якая датычыцца газу, не існуе. Што датычыцца нафты, то мы зараз маем мытныя пошліны на нафту, якая пастаўляецца з Расіі. Гэта значыць, што наш Мытны саюз з'яўляецца вельмі хісткім. У ім знікла вельмі важная частка.

Таму мы маем вельмі істотны крок назад. Нашы галоўныя эканамічныя інтарэсы па газу і нафце абараняюцца не механізмам Саюзнай дзяржавы, а міждзяржаўнымі дамовамі, якія не маюць адносінаў да Саюзнай дзяржавы. І можна гаварыць пра тое, што Саюзная дзяржава з'яўляецца найбольш пацярпелым інстытутам у эканамічнай вайне.

**— Ці можна чакаць, што эканамічнае «раздзяленне» дзвюх краін будзе працягвацца ў бліжэйшы час?**

— Хутчэй за ўсё, так. Мы будзем разыходзіцца, але пакуль не зразумела, якімі тэмпамі. Бо з сітуацыі, якая склалася, беларуская дзяржава зрабіла выснову: нам патрэбна энергетычная незалежнасць. Мы гатовыя супрацоўнічаць па гэтаму пытанню з Еўропай. І гэта ўжо ёсць база для новага курсу, які разводзіць нас з Расіяй.

Расія нас адштурхнула. Як будуць далей развівацца нашы адносіны, праз канфлікты ці яшчэ неяк, — пытанне складанае. Але хутчэй за ўсё мы будзем «плаваць» у нейкім іншым накірунку.

**— Ці будзе, на ваш погляд, Расія ў бліжэйшы час паскараць тэмпы працы па змяншэнню залежнасці ад Беларусі ў транзіце газу і нафты?**

— Думаю, не. Бо ўсе вядомыя праекты, якія сапраўды могуць істотна паўплываць на сітуацыю, з'яўляюцца доўгатэрміновымі. А новых праектаў Расія нідзе не дэкларуе. Нават калі яны і будуць прадэклараваны, то яны будуць патрабаваць значнага часу.

**— Аднак кіраўнік расійскай кампаніі «Транснафта» заявіў, што накіраваў кіраўніцтву Расіі прапановы аб тым, як прыкладна за 13—14 месяцаў ледзь не цалкам вырашыць праблему транзітнай залежнасці ад Беларусі.**

— Думаю, што гэта нерэальна. Бо праз Беларусь нафта ідзе перш за ўсё ў Цэнтральную Еўропу і туды вельмі дорага дастаўляць нафту іншымі шляхамі. Расія можа імкнуцца да нечага такога, але спатрэбіцца не 13—14 месяцаў, а значна больш часу.

Тут ёсць іншае пытанне. Частка транзіту можа скараціцца, бо Расія можа не весці мадэрнізацыю на сваёй тэрыторыі нафтаправода «Дружба». А яму ўжо 40 гадоў. І ён аб'ектыўна праз сябе можа прапампоўваць менш нафты. І як кажуць вельмі сур'ёзныя эксперты, Расія, нібыта, арыентуецца на тое, што транзіт скароціцца недзе на пачатку 2009-га. Але гэта не поўнае скасаванне транзіту.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**
**Фота аўтара і Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў.**

«Прамая лінія» «Звязды»

# Зямельнае пытанне патрабуе сур'ёзнага падыходу

**Па тэматыцы, звязанай з зямельнымі і маёмаснымі адносінамі, па тэме рэгістрацыі нерухомай маёмасці і механізму продажу зямельных участкаў чытачам «Звязды» адказвае старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі Георгій КУЗНЯЦОЎ.**

☎ ***— Недзе месяц таму дэпутаты ў парламенце краіны разглядалі новую рэдакцыю Кодэкса аб зямлі. Чула ад суседзяў, што па гэтаму дакументу зямельны падатак для фізічных асоб у населеных пунктах істотна павялічыцца. Няўжо гэта праўда?***

**Святлана МУРАШКА,** *г. Клецк.*

— Зямельны кодэкс не разглядае пытанні падатку на зямлю. Узровень зямельнага падатку разглядаецца асобнымі артыкуламі заканадаўства. Пакуль гэта пытанне ў кодэксе не разглядаецца.

***— Ці прадугледжана істотнае павелічэнне зямельнага падатку сёлета?***

— Не. У сувязі з паказчыкамі інфляцыі яго памер сёлета ў параўнанні з мінулым годам павялічыцца толькі на 8 працэнтаў.

☎ ***— Чула, што вашы спецыялісты рыхтуюць спісы жылых дамоў, у якіх ніхто не жыве. Мы з мужам свайго жылля не маем, здымаем кватэру, але грошай для куплі кватэры ў сталіцы няма. Можа мы купілі б у прыгарадзе стары дом у дрэнным стане? Дзе можна пазнаёміцца з падрыхтаванымі спісамі?***

**Людміла КАЛЕСНІКАВА,** *г. Мінск*

— Такія спісы павінны ўжо быць створаны мясцовымі раённымі ўладамі пры дапамозе ў тым ліку і нашых спецыялістаў. Рэгістры пустых дамоў ствараюцца згодна з дзеяннем Указа кіраўніка дзяржавы № 70, які ўступіў у сілу летась. Спісы пустога жылля і дамоў у вельмі дрэнным стане знаходзяцца ў Мінскім райвыканкаме.

**— Мы хочам выбраць пусты дом, каб потым адрамантаваць і жыць. Калі можна будзе купляць такія дамы?**

— Па продажу такой нерухомасці ёсць два варыянты. Калі дом будзе прызнаны старым і безгаспадарчым, то яго будзе прадаваць мясцовы орган улады. Такія дамы патрабуюць капітальнага рамонту, на што неабходна мець істотныя фінансавыя сродкі. Ёсць проста вельмі старыя дамы ў вельмі дрэнным стане. На такую нерухомасць ёсць уласнікі, але яны не дагледаюць жыллё. Па такіх аб'ектах мясцовыя органы ўлады могуць прымаць рашэнне аб іх зносе.

Спадарыня Людміла, дам вам слушную параду: у вёсках вакол Мінска такога дома вы ўжо не знойдзеце. У апошнія гады ўсе старыя дамы ў прыгарадзе сталіцы былі прададзены і перапрададзены па некалькі разоў. З вашымі невялікімі фінансавымі магчымасцямі шукайце такія дамы ўжо на большай адлегласці ад Мінска.

***(Працяг будзе.)***

**Сяргей КУРКАЧ.**

## СВЯТА СТАЛІЧНЫХ ЧЭКІСТАЎ

**22 студзеня споўніцца 89 гадоў з моманту ўтварэння ўпраўлення КДБ па Мінску і сталічнай вобласці.**

Адметна, што сталічная спецслужба была заснавана Мінскім Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў, які на пачатку 1918 года прыняў рашэнне аб арганізацыі аддзела па барацьбе з контррэвалюцыяй і спекуляцыяй.

Як паведамілі «Звяздзе» ў прэс-службе ўпраўлення КДБ па Мінску і сталічнай вобласці, зараз важнейшымі задачамі чэкістаў з'яўляюцца: нейтралізацыя знешніх і ўнутраных пагроз Беларусі, забеспячэнне стабільнасці канстытуцыйных асноў дзяржавы, разведка і контрразведка, барацьба з тэрарызмам і экстрэмісцкімі праявамі, арганізаванай злачыннасцю, карупцыяй і наркабізнэсам, процідзеянне эканамічным злачынствам. Летась сталічныя чэкісты, напрыклад, прадухілілі нанясенне эканамічнага ўрону краіне на суму каля 6,5 мільярда рублёў, вярнулі ў дзяржаўную скарбонку 3 мільярды рублёў.

Больш таго, супрацоўнікі КДБ садзейнічалі прыцягненню інвестыцый на 57,8 мільярда рублёў.

Сталічныя чэкісты таксама лакалізавалі дзейнасць адной арганізаванай злачыннай групоўкі, выявілі 18 фактаў карупцыі, спынілі 7 спроб кантрабанды, перакрылі 2 міжнародныя каналы паставак наркатычных і псіхатропных рэчываў.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## КІТАЙЦЫ ПАБУДУЮЦЬ ЗАВОД У ПРУЖАНСКІМ РАЁНЕ

Днямі падпісаны кантракт паміж кіраўніцтвам Пружанскага раёна і кітайскай дзяржаўнай карпарацыяй «CLETS», па якому кітайская фірма бярэцца ўзвесці «пад ключ» крухмальны завод у вёсцы Харава ААТ «Айчына». Як паведаміў намеснік старшыні Пружанскага райвыканкама Васіль Казак, літаральна адразу пасля заключэння дагавора кітайскія спецыялісты прыступілі да праектавання. У сакавіку яны маюць намер прыехаць на Пружаншчыну з камплектацыяй і прыступіць да мантажу. Завод будзе выпускаць у год 10 тысяч тон крухмалу для медыцынскай, парфумернай, харчовай прамысловасці і бытавых патрэб.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ФОКУСЫ-ПОКУСЫ І НЕЧАКАНЫЯ АМПЛУА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Пяць хвілін да старту

Апошнія рэпетыцыі перад здымкамі шоу — бадай, самыя цяжкія. Усе нервуюцца: і педагогі, і канкурсанты, у якіх пры выкананні асабліва складаных элементаў баляць любімыя гузакі. Да таго ж рэпетыцыі праходзяць у паўзмроку, каб «выставіць святло» пад кожны канкрэтны нумар. Да таго ж неабходна абавязкова хоць раз прайсці нумар у сцэнічным касцюме — проста каб быць упэўненым, што ўсё ў парадку. Артысты дысцыплінаваныя, як школьнікі — высветліўшы чарговасць выступленняў, пераапранаюцца, займаюць свае месцы і цярпліва чакаюць. Тэлевядучы Сяргей Савіцкі, пераапрануўшыся ў чырвоны камбінезон, здаецца, выкарыстоўвае кожную свабодную хвілінку і кожны вольны куток, каб пачаць жангліраваць тэніснымі мячыкамі. Люся Лушчык з перабінтаваным левым каленам і правым запясцем перакладвае ў толькі ёй вядомым парадку серабрыстыя хула-хупы. Педагог па 10 разоў паказвае кожнаму тэхніку паходкі, жэстаў рук і нават паклонаў. А што вы думалі — гэта таксама неабходнае майстэрства, мала бездакорна выканаць нумар, трэба яшчэ прыгожа пайсці з манежу. «Спінка» і «постаць трымаем» — час ад часу строга нагадваюць трэнеры ўдзельнікам.

Менеджар па прафесіі Святлана Белазерскіх асвойвае «джыгітоўку на вярблюдзе» — махіна вышынёй у паўтары Святланы ледзьве змяшчаецца на тумбе, а дзяўчына тым часам з усіх сіл паказвае, што яна расслабленая ўсходняя жанчына. Вакол манежа блукае банкір Юрый Каштанаў, якому трэба будзе пераўвасобіцца ў ілюзіяніста, і дастае то ў мяне з валасоў, то з кішэні ў рабочага сцэны дробныя манеты. Грошыкі з прыгожым звонам падаюць у бляшанае вядзерца — і зноў «з'яўляюцца» ў самых неверагодных месцах.

— Даніну збіраеце? — жартую я.

— Грошы з паветра раблю, — абаяльна ўсміхаецца Юрый.

Некалькі разоў упарта рэпеціруе свой вельмі складаны ў тэхнічным плане, але затое і вельмі прыгожы акрабатычны нумар на кольцах Вячаслаў Харанека. Спачатку яны з партнёрам нагадваюць скульптурную кампазіцыю «Рабочы і калгасніца», але ўжо праз хвіліну недарэчныя параўнанні вылятаюць з галавы, застаецца толькі павага да артыстаў...



Віктар АРЦЁМАЎ: гэты закружыць не толькі рэйнскае кола, але і галовы прыхільніц.

Для танцора стрыптызу Віктара Арцёмава, які будзе скакаць з «рэйнскім колам», рэжысёр патрабуе асаблівы фон — «што-небудзь, што мігціць і скача». Хлопец настолькі віртуозна спраўляецца з вялізным колам, дзе могуць змясціцца тры такія, як ён, — нават з цяжкасцю верыцца, што на трэніроўкі ў Віктара быў толькі месяц.

А нумар спявачкі Алены Грышанавай, што б там ні гаварылі рэжысёры пра вобраз гераіні Любові Арловай з фільма «Цырк», насамрэч, я ведаю, называецца «Смерць мужчынам». Улічваючы шыкоўную постаць артысткі, яе палёт на арэлях — відовішча не для слабанервовых. Асабліва калі пад канец нумара, знаходзячыся дагары нагамі на трохметровай вышыні, Алена адшпільвае абедзве страхоўкі...

Словам, усе цуд якія прыгожыя і адказныя. Шчыра кажучы, я не ведаю, як у журы паднімецца рука выбіраць з іх двух слабейшых.

## У кадры і па-за ім

Усё яшчэ сумняваецеся, ці варта сёння ў 21.05 уключаць тэлевізар? Тады паспрабуем крыху расказаць пра тое, што вы ўбачыце... і не ўбачыце.

Да апошняга моманту арганізатары шоу трымалі ў сакрэце склад журы. Толькі непасрэдна перад пачаткам шоу вядучыя «Зорнага цырка» Ягор Хрусталёў і Вольга Палякова прадставілі іх публіцы. Такім чынам, ацэнкі ўдзельнікам выстаўлялі старшыня журы, прадстаўнік галандскай кампаніі, якая распрацоўвала канцэпцыю шоу, Хайс Ван Дам, рэжысёр тэатра і кіно Аляксандр Яфрэмаў, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Ядвіга Грыгаровіч, легенда айчыннага тэлебачання Элеанора Язерская і прадстаўнік славутай цыркавой дынастыі Юрый Дураў. (Надалей, як мяркуецца, «журыць» канкурсантаў прыедуць браты Запашныя, прадстаўнік Цырка Нікуліна і іншыя цыркавыя зоркі.)

Па сектарах раўнамерна размеркаваліся групы падтрымкі ўдзельнікаў. Скажам, за Алену Грышанаву сабралася «хварэць» вялікая артысцкая тусоўка: гурт «Тяни-Толкай» у поўным складзе, Святлана Стацэнка, Галіна Шышкова, Дзіма Калдун. Зрэшты, артысты, магчыма, прыйшлі і не з прафесійнай салідарнасці, а з простай чалавечай цікаўнасці. Затое група вядучых АНТ дакладна хварэла за сваіх: Сяргей Дарафееў трымаў навідавоку плакат «Наше утро» — за Радзіну!». Асобна сядзелі балельшчыкі Люсі Лушчык з плакатам «Люся, ты першая, і не толькі на Першым музычным». Нечакана вялікая група падтрымкі сабралася ў адзінага іншагародняга канкурсанта, настаўніка беларускай мовы і літаратуры з Віцебска Паўла Кежы — балельшчыкі нават прыдумалі для яго забаўную вершаваную крычалку... Словам, сярод балельшчыкаў можна было смела праводзіць асобны конкурс — на самую арыгінальную форму падтрымкі любімага канкурсанта.

Нумар першапраходца дастаўся Святлане Белазерскіх і вярблюду Чэкал. Прычым чацвераногі артыст доўга не жадаў выходзіць на сцэну. «Засядзеўся ў бары, — жартавалі вядучыя. Вярблюды п'юць усяго раз у месяц, але затое як дарвуцца...». Калі, нарэшце, жывёла ўсё ж паслухалася дрэсіроўшчыка, Святлане выпала яшчэ адно выпрабаванне. Я маю на ўвазе зусім не джыгітоўку на баку вярблюда. Бо ад танцора эротык-шоу яшчэ можна было чакаць чагосьці «гэткага», а эратычныя моманты ў выступленні менеджара былі зусім не запланаваныя. Тое, як мужная дзяўчына з імі змагалася, — асобная гісторыя, якая выклікала апладысменты і спрэчкі ў журы. І гэта вы ўбачыце.



Алена ГРЫШАНАВА гойдалася на арэлях практычна як Любоў Арлова.

А вось чаго не ўбачыце — напрыклад, апладысментаў на бягу ад тых гледачоў, хто ўсё ж парушыў строгую забарону вядучых, падчас здымак не хадзіць. І падтанцоўку ад саміх вядучых на «даху» над манежам у паўзах паміж выступленнямі. І танцуючага апаратара — улічваючы, што ўсё шоу гэты чалавек цягаў цяжкую камеру ў руках, то ў перапынках яму проста неабходна было растрэсці рукі-ногі. А парны забег камеры і апаратара, якога страхаваў за пояс яшчэ адзін тэлевізійнік, увогуле мог стаць асобным цыркавым нумарам. Гэтаксама як і сольны танец дырэктара Белдзяржцырка Таццяны Бандарчук, якая, між іншым, па сумяшчальніцтву старшыня беларускай Федэрацыі танцавальнага спорту.

Затое некаторых момантаў не бачылі гледачы ў цырку — напрыклад, ролікаў аб тым, як удзельнікі рыхтаваліся да сваіх нумароў. «Нічога, пацярпіце да суботы», — суцяшаў нас Ягор Хрусталёў, забаўляючы ўзамен шаноўную публіку вольным перакладам фраз старшыні журы «Для тых, хто зразумеў толькі словам «Кэмеэл», нагадваю, што курэнне шкодзіць вашаму здароўю», і жартамі накшталт «Не часта даводзіцца ўбачыць спявачку дагары нагамі».

Усе дванаццаць нумароў былі абсалютна рознымі — адны здаваліся лёгкімі звонку, другія выклікалі захопленае «ах!» ад пачатку і да канца. І кожны ўдзельнік, акрамя порцыі апладысментаў, атрымліваў каментары пра свае прамашкі і памылкі — ад вядучых, ад журы і ад дырэктара «Зорнага цырка». А некаторым даставаліся дастатковыя ўхваленні за мужнасць — напрыклад, Вользе Баранскай, якая, нягледзячы на сур'ёзную траўму, адкатала свой нумар на роліках і прымусіла свайго сына Марата ганарыцца такой мамай; Віктару Арцёмаву, які пасля аварыі некалькі месяцаў увогуле не мог рухацца — а зараз выпісваў на манежы крэндзелі і сальта; нарэшце, Вячаславу Харанеку — моцнаму ва ўсіх сэнсах мужчыне, які не пабаяўся... прызнацца ў слабасці. Асобнае дзякуй ад прафесійнага дрэсіроўшчыка Юрыя Дурава атрымаў яшчэ Георгій Волчэк, які пакарыў публіку нумарам з сабачкамі. «Не паверыце, упершыню сабачкі зрабілі ўсё як трэба зараз — можа, трэба было адразу твар нафарбаваць? — жартаваў пасля нумара артыст. — Ну, я іх узнагароджу: адну руку яны пакусалі, цяпер аддам і другую».

А хто, цікавіцеся, усё ж набраў менш за астатніх балаў і стаў першымі двума намінантамі, далейшы лёс якіх вызначаць тэлегледачы з дапамогай SMS-галасавання? Глядзіце шоу, спадарства, глядзіце шоу — усё даведаецеся!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**ОАО «Управление механизации № 79»**

**извещает своих акционеров о проведении 24 февраля 2007 года очередного общего собрания акционеров.**

***Повестка дня:***

*1. О финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2006 году и основных направлениях деятельности Общества в 2007 году.*

*2. Утверждение годового отчета и баланса Общества.*

*3. О распределении чистой прибыли за 2006 год и выплате дивидендов за 2006 год.*

*4. Утверждение использования чистой прибыли Общества на 2007 год.*

*5. Отчет Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии о работе в 2006 году.*

*6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.*

*7. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.*

*8. О реорганизации ОАО «УМ № 79» путем присоединения к нему ОАО «УМ-91».*

*9. Внесение изменений и дополнений в Устав Общества. Утверждение Устава в новой редакции.*

Место проведения собрания — МГПТУ № 31 (г. Минск, ул. Буденного, д. 8).

Время начала проведения собрания — 13.00.

Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания с 11.00 до 12.45 по предъявлению документа, удостоверяющего личность, а представителей акционеров — и доверенности.

Время и место ознакомления акционерами с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни, начиная с 16 февраля 2007 г. по месту нахождения Общества с 13.00 до 17.00, в день проведения собрания — по месту проведения собрания.

**Наблюдательный совет.**

**Открытое акционерное общество «Минскторгмаш»**

(220075, г. Минск, ул. Промышленная, 22)

покупает простые (обыкновенные) акции:

Эмитент — открытое акционерное общество «Минскторгмаш»,

Адрес эмитента: 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 22,

Количество: 4422 (четыре тысячи четыреста двадцать две) акции,

Цена: 8000 (восемь тысяч) белорусских рублей за одну акцию,

Форма оплаты — для физлиц — наличный расчет, для юрлиц — безналичный расчет,

Порядок оплаты — оплата в течение 20 дней с момента заключения договора,

Сроки покупки — с 30 января 2007 г. по 30 марта 2007 г.

**Адрес, по которому будут заключаться договора: 220075, г. Минск, ул. Промышленная, 22.**

В связи с утерей считать недействительными страховые свидетельства серии НС номера 0016922, 0013504—0013511 в количестве 8 (восьми) штук.

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока смуткуе з выпадку заўчаснага сыходу з жыцця намесніка галоўнага рэдактара штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» Алеся Іосіфавіча ГАЎРОНА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.**

# Доўгая дарога да храма

**Вёска Дарасіно здаўна была вядомая сваімі майстрамі-ганчарамі і праваслаўнымі традыцыямі. Толькі час не быў літасцівы ні да рэлігіі, ні да народнага промыслу. Перад Другой сусветнай вайной дарасінскі храм быў закрыты, а ў 1950-м наогул разабраны па бярвёнах пад вясковы клуб. З-за незапатрабаванасці прыйшло ў заняпад і ганчарства. Але дарасінцы паказалі, што яны шануюць сваю гісторыю і не згубілі духоўнасці.**





У мінулую суботу быў асвечаны новаўзведзены Свята-праабражэнскі храм, вельмі падобны на той, які ўзводзілі продкі 170 гадоў таму.

Дзякуючы Міхаілу Хілько, ветэрану вайны, старэйшаму жыхару вёскі, які ў 1941 годзе зрабіў фотаздымкі, удалося аднавіць аўтэнтычнае аблічча храма. Міхаіл Данілавіч прыклаў нямала стараннях, каб распачалася будоўля і збіраліся грошы. Узводзілі храм, як кажуць, метадам народнай будоўлі. Кіраваў працай святар з гарпасёлка Урэчча айцец Аляксандр Драгун. Вяскоўцы сапраўды стараліся. Іхнія дзеці і ўнукі, якія жывуць далёка ад Дарасіна, таксама не былі ўбаку. Вось і ўнучка Міхаіла Хілько Ірына Мазалеўская з мужам Ігарам ахвяравалі мільён беларускіх рублёў. Шэсць гадоў раздзяляюць закладку першага каменя і асвячэнне вясковай святыні. Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі прысутнічаў на ўрачыстасці і адзначыў многіх непасрэдных удзельнікаў стварэння храма. Жыхары Дарасіно — Лядзвіга Зубарэвіч і Міхаіл Хілько і старшыня СВК Васіль Быстрэнка — узнагароджаны медалямі Беларускай праваслаўнай царквы святіцеля Кірылы Тураўскага. А святар Аляксандр Драгун — залатым крыжам.

Гэта ўжо пятая па ліку вернутая з небыцця рэлігійная святыня на Любаншчыне. Несумненна, што вернуцца да жыцця і лепшыя народныя традыцыі гэтага краю.



***На здымках: у час святочнай літургіі; хросны ход з абразамі; жыхарка вёскі Нежараўка Ангеліна АСТРЭЙКА з граматай ад Уладыкі Філарэта.***

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## Спорт-тайм

### УВЕСЬ КАМПЛЕКТ УЗНАГАРОД — У НАШЫХ БІЯТЛАНІСТАЎ

На зімовай Універсіядзе ў Турыне беларуска Надзея Скардзіно стала сярэбраным прызёрам у гонцы на 15 кіламетраў. Наш біятланіст Сяргей Новікаў заняў першае месца ў гонцы на 20 кіламетраў. Дарэчы, на этапе Кубка свету ў Славеніі беларуская страляючая лыжніца Наталля Сакалова здабыла «бронзу» у гонцы праследавання.

### НЕЧАКАНАЯ АДСТАЎКА

Любамір Пакавіч адпраўлены ў адстаўку з пасады галоўнага трэнера мінскага хакейнага клуба «Дынама», нягледзячы на тое, што каманда разам з настаўнікам заваявала кубак Беларусі і зараз знаходзіцца ў тройцы лідараў нацыянальнага першынства. Кіраўніцтва «белаблакітных» пакуль не дало афіцыйнага тлумачэння развітання са славацкім спецыялістам. Магчыма, гэта звязана з запланаванымі спалучэннямі трох сталічных дружын для выступлення ў расійскай вышэйшай лізе. Пакуль кіраваць ігракамі будуць Аляксандр Андрыеўскі і Алег Мікульчык.

### З «МІНЕРАЛЬНАЙ» КАМАНДЫ Ў «РАЧНУЮ»

Хутчэй за ўсё галоўным трэнерам гродзенскага футбольнага клуба «Нёман» стане былы настаўнік жданавіцкай «Дарыды» Людас Румбуціс. Рашэнне кіраўніцтва каманды прыме ў бліжэйшы час.

## Плацдарм

# ТЭНДАР ЗАПАВОЛЕНАГА ДЗЕЯННЯ

**На шляху знішчэння запасаў мін у Беларусі ўзніклі «еўрабюракратычныя» бар'еры**

**Беларусь паступова пазбаўляецца ад небяспечнай спадчыны, пакінутай Савецкай Арміяй.**

Як паведаміў журналістам начальнік інжынерных войскаў Узброеных Сіл Беларусі Сяргей ЛУЧЫНА, напрыканцы мінулага года наша краіна ўтылізавала тратылавыя міны. Адметна, што істотную дапамогу ў гэтым нам аказалі Канада і Літва, якія выдзелілі нам 205 тысяч еўра.

Аднак на гэтым мінныя праблемы нашай краіны не скончыліся. На вайсковых складах засталося больш за 3,5 мільёна касетных мін ПФМ, якія ўтрымліваюць сінільную кіслату. Часу на ўтылізацыю вадкасных мін засталося няшмат. Далучыўшыся да Атаўскай канвенцыі, Беларусь абавязалася ліквідаваць усе «мінныя запасы» да 1 сакавіка 2008 года.

Істотную дапамогу ў гэтым нам пагадзіцца аказаць Еўрапейскі саюз. Краіны ЕС маюць намер выдаткаваць на ўтылізацыю вадкасных мін 4 мільёны еўра. Аднак на шляху знішчэння гэтых смертаносных прылад узніклі «еўрабюракратычныя» бар'еры. Справа ў тым, што Еўрасаюз можа выдаткаваць сродкі толькі пасля правядзення тэндару, пераможцы якога павінны пазбаўляць нас ад небяспечнай спадчыны Савецкай Арміі. Летась тэндар «сарваўся». Калі адбудзецца новая працэдура выбару значэння «фірмы-пераможцы» яшчэ невядома. Часу на сам працэс знішчэння мін застаецца ўсё менш і менш. А значыць Беларусь можа не па сваёй віне парушыць узятыя на сябе абавязкі наконт тэрміну знішчэння процілпяхотных мін. Паводле слоў генерала Лучыны, прадстаўнікі ЕС заклікалі беларускі бок не драматызаваць сітуацыю і суцяшалі тым, што наша краіна не адзіная будзе вымушана падоўжыць тэрмін знішчэння процілпяхотных мін. І хоць санкцый за падобныя парушэнні не прадугледжана, Беларусь сама зацікаўлена ў тым, каб як мага хутчэй пазбавіцца ад небяспечнай спадчыны. Гарантыйны тэрмін захоўвання памянёных мін скончыўся яшчэ ў 1999 годзе. Генерал Лучына, праўда, запэўніў, што «пратэрмінаваныя» міны знаходзяцца пад пастаянным кантролем і, паводле заключэння замежных спецыялістаў, умовы іх захавання на складах Узброеных Сіл Беларусі адпавядаюць міжнародным нормам бяспекі. Аднак лепш усё ж як мага хутчэй пазбавіцца ад гэтых небяспечных прылад.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

# І ТРОШАЧКІ КАНАЎ

**Сезон «Канаманіі» ў Беларусі адкрыў самы арыгінальны фільм 2006-га «Лабірынт Фаўна» мексіканскага рэжысёра Гільерма Дэль Тора.**

«Канаманія» — гэта праект, дзякуючы якому ёсць магчымасць паглядзець у Беларусі самыя нашумелыя фільмы сусветнага кіно. Гэта фільмы, якія былі ўключаны ў конкурсную ці пазаконкурсную праграму Канскага міжнароднага кінафестывалю.

За гэты праект трэба падзякаваць яго заснавальнікаў — УП «Кінавідэапракат» і радыёстанцыі «Юністар», якія з 2002 года знаёмяць беларускіх кінаманаў з культавымі фільмамі, якія скарылі Еўропу. Летась, напрыклад, была магчымасць паглядзець фільмы рэжысёраў Вудзі Алена, Педра Альмадовара, Дэвіда Лінча, Кена Лоуча, Акі Каурысмякі, Даменіка Мол, Дарэна Аранофскі. І пачатак 2007-га абяцае выдатныя знаёмствы: праект уступае ў новы этап.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# СТАРЫ САЙТ НА НОВЫ ЛАД

**У сусветнай павуціне з'явілася абноўленая версія сайта Нацыянальнага алімпійскага камітэта, які стаў больш дынамічным, інфарматыўным і зручным у карыстанні.**

Знайсці можна па тым жа адрасе — www.noc.by. Новымі сімваламі сайта сталі пяць алімпійскіх чэмпіёнаў — уладальнікі «золата» Афін-2004 лёгкаатлет Юлія Несцярэнка і дзюдаіст Ігар Макараў, пераможцы на Гульнях у Сіднеі-2000 лёгкаатлеткі Яніна Карольчык (ядро) і Эліна Зверава (дыск), а таксама прадстаўніца акадэмічнай грэблі Кацярына Карстэн.

Паводле слоў распрацоўшчыка сайта Андрэя Астаўненкі, зараз ёсць цудоўная магчымасць стварыць аптымальны варыянт алімпійскага сайта. Тут і анонс спаборніцтваў з календаром, і вынікі выступлення, пазначана, колькі дзён засталося да Алімпіяды, архіў фотаздымкаў, адрасы спартыўных сайтаў, спартыўная статыстыка, новыя рубрыкі і магчымасць даслаць электронныя пісьмо.

**Ірына ПРЫМАК.**




## Асобы

# Браніслаў Тарашкевіч і яго «Беларуская граматыка для школ»

**20 студзеня спаўняецца 115 гадоў з дня нараджэння Браніслава Тарашкевіча — беларускага асветніка, грамадска-палітычнага дзеяча, мовазнаўца, перакладчыка, публіцыста...**

Ён скончыў Петраградскі ўніверсітэт у 1916 годзе (з 1912-га быў адным з кіраўнікоў знакамітага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка), пасля два гады працаваў на кафедры рускай мовы і славеснасці... У 1921—1922 гадах Браніслаў Адамавіч быў дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі, стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы... У 1925-м з'явіўся адным з заснавальнікаў Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ), уступіў у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі (КПЗБ)... Некалькі разоў арыштоўваўся польскімі ўладамі, прыгаворваўся да турэмнага зняволення, да катаржнай турмы... З верасня 1933 года, па абмене палітвязнямі, жыў у Савецкім Саюзе... У 1937-м быў арыштаваны, асуджаны да вышэйшай меры пакарання (расстрэлу) па справе так званага «Беларускага нацыянальнага цэнтра»... Рэабілітаваны ў студзені 1957 года «ў сувязі з адсутнасцю саставу злачынства»...

У друку ён выступаў з 1914 года, у часопісах «Раніца», «Лучынка» (цікавая дэталь: Браніслаў Тарашкевіч публікаваўся пад псеўданімам Т. Язычнік).

У 1918 годзе выдаў «Беларускую граматыку для школ», якая адыграла значную ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы.

У заходнебеларускім друку выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі, прысвечанымі нацыянальна-вызваленчаму руху, публікаваў свае пераклады з «Іліяды» Гамера...

У час зняволення ў польскай турме працаваў над удасканаленнем «Беларускай граматыкі...», пераклаў на беларускую мову «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча...

І яшчэ цікавы факт: у 1936-м Дзяржаўнае выдавецтва БССР рыхтавала да выдання зроблены Браніславам Тарашкевічам поўны пераклад на беларускую мову «Іліяды» Гамера. Калі б не арышт 6 мая 1937 года...

Як ацэньваецца ўклад Браніслава Тарашкевіча ў беларускае мовазнаўства зараз, з вышыні XXI стагоддзя? Пра гэта я папрасіла расказаць **дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара Аляксандра ЛУКАШАНЦА.**

— Можна адказаць адназначна: Браніслаў Тарашкевіч адыграў выключна важную ролю ў развіцці і ўдасканаленні беларускай літаратурнай мовы, у прыватнасці, у распрацоўцы правілаў і нормаў беларускай арфаграфіі. Таму што яго «Беларуская граматыка для школ», першае выданне якой убачыла свет у 1918 годзе, была фактычна першай паспяховай спробай унармаваць беларускі правапіс. У сваёй «Граматыцы» Б. Тарашкевіч вельмі ўдала спалучыў два асноўныя прынцыпы правапісу: фанетычны і марфалагічны. Пры гэтым фанетычны прынцып прымяняўся і прымяняецца да сённяшняга часу ў асноўным у дачыненні да правапісу галосных, а марфалагічны прынцып — да правапісу зычных. Гэта спалучэнне, якое захоўваецца і ў дзеючым зводзе «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (Мн., 1959), у значнай ступені вызначае і спецыфіку беларускай літаратурнай мовы.

Важна адзначыць, што «Беларуская граматыка для школ» Б. Тарашкевіча на працягу 1920-х гадоў вытрымала некалькі выданняў і забяспечыла выкарыстанне беларускай мовы ва ўсіх сферах ужытку, у якія яна інтэнсіўна ўкаранялася. І самае галоўнае — яна забяспечыла функцыянаванне беларускай мовы ў сферы школьнага навучання. У сувязі з гэтым значэнне кнігі, а значыць і асобы Браніслава Тарашкевіча надзвычай важнае, яго цяжка пераацаніць.

Гэтая праца, дарэчы, вельмі актуальная і сёння.

Той правапіс, якім мы карыстаемся зараз, і які забяспечвае выкарыстанне беларускай пісьмовай мовы ва ўсіх сферах жыцця сучаснага беларускага грамадства, у прынцыпе, грунтуецца на тых асноўных палажэннях, якія былі выпрацаваны Браніславам Тарашкевічам. На сённяшні дзень, як вы ведаеце, даволі востра стаяць праблемы ўнясення змяненняў у існуючы правапіс і падрыхтоўку новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Веданне таго, што зрабіў Б. Тарашкевіч і якім было яго ўласнае стаўленне да сваёй працы, вельмі важнае, каб і сённяшнія праблемы вырашыліся найбольш аптымальна.

Трэба адзначыць, што «Граматыка» Б. Тарашкевіча была сапраўды першай спробай унармавання беларускай пісьмовай мовы і, зразумела, аўтар не мог ахапіць увесь комплекс правапісных праблем, якія тады стаялі. Безумоўна, прапанаваны ім правапіс патрабаваў і пэўнага ўдасканалення — гэта добра разумеў і сам аўтар. У прадмове да 5-га выдання «Граматыкі» Б. Тарашкевіч пісаў, што аўтар сам добра разумее ўсе нюансы, якія патрабуюць удасканалення і дапрацоўкі. Невыпадкова ў сярэдзіне 1920-х гадоў іменна настаўнікамі-практыкамі было пастаўлена пытанне аб удасканаленні беларускага правапісу. У 1926-м была праведзена Акадэмічная канферэнцыя па правапісу, і пачалася падрыхтоўка рэформы беларускага правапісу.

**— Аляксандр Аляксандравіч, як вы мяркуеце, ці пакрыўдзіўся б Браніслаў Тарашкевіч, калі б даведаўся, што зараз дарэформенную беларускую мову называюць «тарашкевіцай» — хтосьці са знакам «плюс», хтосьці, наадварот, скептычна ці нават негатыўна?**

— Думаю, адназначна можна сказаць: Браніслаў Адамавіч не мог бы пакрыўдзіцца на тое, што распрацаваны ім правапіс беларускай мовы зараз атрымаў назву «тарашкевіца». Гэта сведчанне прызнання яго заслуг ва ўдасканаленні правапісных нормаў новай беларускай літаратурнай мовы. Гэтым, думаю, можна толькі ганарыцца... Праблема, праўда, заключаецца ў тым, што сёння далёка не заўсёды назва «тарашкевіца» выкарыстоўваецца якраз да правапісу, прапанаванага менавіта «Граматыкай» Б. Тарашкевіча. На жаль, яна часта выкарыстоўваецца для абазначэння самых розных варыянтаў і мадыфікацый дарэформеннага правапісу — што не адпавядае рэчаіснасці і не зусім карэктна... Таму, мяркую, тэрмін «тарашкевіца» мае права на існаванне — але толькі ў дачыненні да таго правапісу, які прапанаваў сам Браніслаў Тарашкевіч у сваёй «Беларускай граматыцы для школ».

**Таццяна ПАДАЛЯК.**

# ШАХМАТЫ

*Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА*

**ПАДУМАЙ І РАШЫ**

**С. Давыдзюк** (Кобрын). (5+2). Мат за 3 хады.



**У. Сычоў** (Мінск). (7+6). Шахматна-шашачная кампазіцыя: а) шахматы — мат за 5 хадоў; б) шашкі — шахматныя фігуры трэба замяніць простымі шашкамі; белыя выйграюць.



Чакаем вашых адказаў!

**ПРАВЕРЦЕ ВАШЫ РАШЭННІ**

Змяшчаем адказы на апошнія заданні — № 17 і № 18 — конкурсу рашэнняў—2006 г.

**№ 17. М. Мінскі.** 1. Кс8+ (1. Л:е4? е1Ф 2. Кс8+ Крс5! 3. Ле5+ Крd4 4. Кce7 e2 5. Kf5+ Крс3 6. Ле3+ Крd2 7. Ке5 Фd1+ 8. Кра3 е1Ф 9. Kf3+ Ф:f3 і нічыя) 1. ... Крс5 2. Ле5+ Крd4 3. Л:е4+! Кр:е4 4. Сg2+ Крd3! 5. Ке5+ Крd2 6. Kf3+! Перастаноўка хадоў недапушчальная: 6. Kd6? е1Ф 7. Kf3+ Кре2!! 8. К:е1 Кр:е1 9. Сс6 е2 10. Ке4 Крd1! 11. Кс3+ Крd2 і нічыя, або 9. Ch3 Крf2 10. Ке4+ Крf3! 11. Кс5 е2 12. Kd3 Кре3 13. Cf5 Крd2 зноў з нічыёй. 6. ... Крd1 7. Kd6 е1Ф 8. Ке4!! Фd2 9. Kf:d2! ed 10. Cf3+ Кре1 11. Кс3+ і белыя выйграюць.

**№ 18. Юстэн.** 1. Kf5+ d2 2. Ке3 d1Ф+ 3. К:d1 К:d1 4. Крb3 е5 5. а4 е4 6. а5 Ке3! 7. а6 Kd5 8. Крс4 Кс7 9. а7 Ка8 10. h6! Падманлівы след: 10. Кр:с5? е3 11. Крс6 е2 12. Крb7 е1Ф 13. Кр:а8 Фе8+ 14. Крd7 Фb5+ 15. Кра8 Фb6 16. h6 Фс7 17. h7 Фс8х. Але ж: 10. ... Крh7 11. Кр:с5 е3 12. Крс6 е2 13. Крb7 е1Ф 14. Кр:а8 Крg6 15. h7! і нічыя.

**ЮБІЛЕЙНЫ КОНКУРС**

Рэдакцыя газеты «Звязда» ў жніўні 2006 года аб'явіла юбілейны конкурс складання эцюдаў, прысвечаны 70-годдзю вядомага майстра эцюда Яўгена Дзвізава са Жлобіна. Суддзя конкурсу — юбіляр.

Ужо даслалі свае творы эцюдысты з Беларусі, а таксама з ЗША, Італіі, Расіі, Латвіі і іншых краін.

Творы на конкурс у двух экзэмплярах, калі ласка, дасылайце да 1 сакавіка 2007 года на адрас рэдакцыі газеты «Звязда»: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

## Дзеля памяці

# У ГІСТОРЫЮ — З ПЕСНЯМІ

Ці можна навучыць любіць беларускія песні? Так, гэта ўсё сваё жыццё імкнуўся рабіць Рыгор Раманавіч Шырма, чалавек, памяць пра якога жыве як сярод музыкантаў, так і сярод простых людзей, якія любяць музыку. І яны ведаюць, што 20 студзеня адзначаецца 115-я гадавіна з дня нараджэння выдатнага музычнага дзеяча Беларусі.

Ён пачынаў свой шлях настаўнікам, але музыкантам яго зрабілі менавіта беларускія песні, у якія ён быў улюбёны. Ён запісаў больш за 2000 песень, склаў шмат фальклорных зборнікаў. Сам рабіў апрацоўкі беларускіх народных песень, якія потым выконвалі музычныя калектывы, хары, якімі ён кіраваў. Так у 1940 годзе на Беласточчыне дзякуючы апантанасці Шырмы фактычна пачалося жыццё аднаго славутага калектыву. Тады ён называўся ансамблем песні і танцаў, а ў 50-м стаў Дзяржаўным хорам БССР. Поспех хору і поспех музыканта Шырмы ішлі паралельна — Рыгору Раманавічу было прысвоена званне народнага артыста СССР. Гэты хор існуе і зараз, толькі цяпер мы яго ведаем пад назвай Дзяржаўная акадэмічная харавая капэла імя Шырмы. Імя Шырмы атрымала і адна з залаў Белдзяржфілармоніі пасля капітальнага рамонту.

У гэтыя дні паслухаць харавую капэлу імя Шырмы ў Беларусі немагчыма — яна гастралюе па Еўропе. А нам застаецца ганарыцца, што традыцыі, якія заклаў майстар, ацэненыя і сёння далёка за межамі яго краіны.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Карцінкі з натуры

# «Смачнае маскоўскае жыццё»

**Маскву некалі ў сярэднявеччы, калі не памыляюся, трапна называлі «трэцім Рымам». Цяжка сказаць, што цяпер з таго «рымскага» перыяду засталося ў расійскай сталіцы, але калі параўноўваць са старажытным Рымам, то, як і ў тым антычным горадзе, хлеба і відовішчаў у сённяшняй Маскве досыць.**

Сказаць, што Масква — хлебны горад, значыць нічога не сказаць. Месцаў добра выпіць і смачна паесці ў Маскве больш чым дастаткова. Штомесяц адчыняюць дзверы некалькі новых рэстаранаў, і іх колькасць ідзе ўжо на тысячы. Навічкі імкнуцца заваяваць прыхільнасць наведвальнікаў экстравагантным інтэр'ерам, арыгінальнай кухняй, бездакорным абслугоўваннем, уменнем прадбачыць жаданні і капрызы багатых наведвальнікаў.

Вытанчаныя стравы з далікатэснай рыбы і экзатычных морапрадуктаў шырока прадстаўлены ў меню дарагіх рэстаранаў. У «Моры часу» ёсць асаблівыя стравы з рыбы барамунды, якую ловяць ля берагоў Аўстраліі.

Заможныя масквічы нярэдка аддаюць перавагу рэстаранам з замежнымі кулінарамі. Не тое што не давяраюць айчыннай кухні, але... Таму ў Маскве як звычайная рэч успрымаецца, калі, як, напрыклад, у рэстаране французскай кухні «Парызын» шэф-повар з Францыі, а шэф-кандытар — з Італіі, калі з гэтых і іншых краін для рэстаранаў двойчы на тыдзень дастаўляюцца свежыя прадукты. У новым вялікім рэстаране «Дайкон сушы энд нудл хаус» повары з Інданезіі і Тайланда гатуюць японскія, тайскія, сінгапурскія, інданезійскія стравы.

Асаблівы і найбольш прыбытковы перыяд для маскоўскіх рэстаранаў — Ражство і Новы год. Высакакласныя рэстараны літаральна са скуры лезуць (а як інакш у рынкавых умовах), каб зацягнуць да сябе і дагадзіць патэнцыяльным багатым наведвальнікам. Таму ўсё павінна быць на вышэйшым узроўні: арыгінальныя навагоднія дэкарацыі, элітныя гатункі шампанскага, віскі, каньяку, на закуску не проста смачная і здаровая з далікатэсаў ежа, а сапраўдныя гастранамічныя сюрпрызы і шэдэўры ад лепшых маскоўскіх і замежных повараў, незвычайны дэсерт, бяспройгрышная латарэя, цудоўны від на Маскву, пажадана на Крэмль. Напрыклад, такім чынам інтрыгуе вядомая гасцініца «Нацыяналь», дзе ёсць магчымасць правесці нясумна навагоднюю ноч за паўцаны ў апартаментах у стылі Людовіка XVI або ў прэзідэнцкім нумары з панарамай Крамля.

Гасцям карпаратыўнага перадnавагодняга свята ў знакамітым гатэлі «Балчуг» на выбар прапанавалі тры праграмы: «сярэбраная», «залатая» і «плацінавая». Зразумела, самая смачная — апошняя. Яе спецыяльнае меню, між іншым, уключала тэрын з дзічыны, крэпінет з голуба з артышокамі, кансамэ з аленіны, тарталеткі мока-маскарпонэ.

Навагодняя праграма атэля «Марыёт» уключала ў сябе творчае асэнсаванне і спалучэнне ў адно цэлае аж трох самых вядомых у свеце карнавалаў: Венецыянскага, Новаарлеанскага і Бразільскага (па ўзору Рыо-дэ-Жанейра). Тут былі вогненныя танцы, конкурсы, выбары караля і каралевы агульнага карнавалу. Гастранамічная частка свята была загадзя дакладна прадуманая: стравы бразільскай і паўночнаітальянскай кухні, крэольскія далікатэсы Новага Арлеана, напрыклад, ананас у полымі моцнага рому.

Якія толькі відовішчы і шоу не адбываюцца ў Маскве! Шматфункцыянальны комплекс «Сурыкаў Hall», акрамя звычайных забаў, прапануе эксклюзіўнае лазернае шоу. Прычым па сюжэту, падказанаму загадзя кліентамі. Гатэль «Чырвоны Халмп» вырашыў здзівіць наведвальнікаў нечаканым шоу «Страсці па віну» са спецыяльнай вячэрай — да кожнай стравы было падабрана адпаведнае віно. Не менш старанна складзена і забаўляльная праграма: спявала амерыканская оперная зорка, выступалі аргенцінскія танцоры танга, іспанскія выканаўцы фламенка. У час «Фуд-шоу» («фуд» з англійскай — «ежа») для маскоўскіх гурманаў гваздом праграмы стаў паказ шакаладных сукенак, так бы мовіць, плён сумесных творчых намаганняў кандытараў і модных дызайнераў.

Рэстаранны бізнэс ужо выдатна засвоіў славутыя мясціны Масквы. Напрыклад, яе, без перабольшання, сэрца — Красную плошчу. Там пад дахам Дзяржаўнага гістарычнага музея адкрыўся рэстаран «Красная плошча, дом 1». Яго «канёк» — смачныя гісторыі. У прамым сэнсе слова. Рэстаран штомесяц ладзіць так званыя гістарычныя абеды. Гэта суцэльны спектакль, у ходзе якога аднаўляецца тая ці іншая знакамітая трапеза, якая ўвайшла ў гісторыю Расійскай імперыі. Яе арганізатары, каб заманіць наведвальнікаў, імкнуцца да дробязяў паўтарыць антураж і атмасферу таго знакамітага застолля, яго меню — у першую чаргу. Так, на апошнім гістарычным абедзе ў гонар Георгіеўскіх кавалераў (іх некалі давалі расійскія імператары ў гонар гадавіны заснавання ордэна святога Георгія), згодна з традыцыямі, яго ўдзельнікаў частавалі, у прыватнасці, юшкай «Багарціён» са слаёнымі піражкамі і расцягаямі, катлетамі «Імперыял» з бараніны, пуншам «Вікторыя». Дадаткова былі наладжаны выставы музейных экспанатаў па тэме абеду, іграў ваенны палкавы аркестр.

**Леанід ЛАХМАНЕНКА.**

***(Працяг будзе.)***

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

# У Блізнят — прыемныя знаёмствы, а ў Шаляў — новая работа

**АВЕН**. Тое, да чаго вы імкнуліся, можа аказацца процілеглым таму, што вам неабходна здзейсніць у рэальнасці. Страх за сваю будучыню, магчыма, прымусіць вас будаваць «вераломныя задумы». Не варта паддавацца гэтаму разбуральнаму жаданню — такія заняткі не лепшым чынам адбіваюцца на характары і самаадчуванні. Паверце, ёсць куды больш рацыянальныя і праўдзівыя спосабы рашэння праблем. У пятніцу вам, верагодна, давядзецца зносіцца з далёкімі сваякамі ці даўно забытымі знаёмымі. У суботу варта здзейсніць сваё жаданне як след адпачыць.

**ЦЯЛЕЦ**. Пачынайце актыўна змяняць сябе і шукайце новыя, неардынарныя шляхі ў асабістым жыцці. Аказаўшы паслугу начальству ў панядзелак, вы тым самым дапаможаце яму вырашыць складаную сітуацыю — і яно абавязкова аддзячыць вам. Пятніца — цудоўны дзень для сустрэч і сяброўскіх вечарынак: не забудзьцеся сазваніцца з сябрамі, блізкімі і знаёмымі — усімі, каго б вам хацелася пабачыць. У канцы тыдня могуць падвесці дзелавыя партнёры. У чацвер магчыма канфліктная сітуацыя з дзецьмі.

**БЛІЗНЯТЫ**. Падзеі спрыяюць таму, каб прыкласці ўсе намаганні для раскрыцця вашага таленту. Вы будзеце незвычайна ўдалым суразмоўцам. Новыя прыемныя знаёмствы адкрыюць перспектывы, аб якіх вы нават не марылі. Чакае поспех у навучанні. Калі неабходна новая інфармацыя, якая дазволіць павысіць узровень прафесіяналізму, — не лянуйцеся атрымаць яе. Пастарайцеся быць больш цярплівымі да навакольных, даруйце ім маленькія слабасці. Старайцеся не давяраць выпадковым знаёмым. Сачыце за сваёй мовай.

**РАК**. Ваш сацыяльны статус дастаткова трывалы, але ў сярэдзіне тыдня спатрэбіцца падтрымка заступнікаў. Звяртаючыся з просьбай, праявіце дыпламатыю і такт. У аўторак ці сераду пастарайцеся быць больш гібкімі пры абмеркаванні з начальствам дзелавых пытанняў. Не настойвайце на сваім пункце гледжання, бо гэта пакажа слабасць вашай пазіцыі. У пятніцу ўважліва сачыце за тым, што адбываецца вакол вас. Не адмаўляйцеся ад новых ідэй.

**ЛЕЎ.** Панядзелак удалы для паездак і камандзіровак. У аўторак непажадана ўступаць у спрэчкі з начальствам. Тыдзень поўны разнабаковых падзей. Не дазваляйце эмоцыям дыктаваць вам учынкі. Больш давярайце сваёй інтуіцыі, але не прымайце скараспелых рашэнняў. Важна вызначыцца з дзелавымі партнёрамі: калі вашы шляхі разыдуцца, не варта шкадаваць аб гэтым. У пятніцу пажадана не прызначаць сур'ёзных сустрэч. Адкладзіце падпісанне важных дамоўленасцяў, бо верагодныя непаразуменні і падманы. Выхадныя абяцаюць быць удалымі ва ўсіх дачыненнях.

**ДЗЕВА**. Пажадана сувымяраць свае сілы і не ствараць сабе перагрузкі на рабоце. Звярніце ўвагу на свой знешні выгляд: намаганні не будуць дарэмнымі, і вас абавязкова заўважаць і ацэняць. У сераду сустрэча са старым сябрам, якую вы даўно адкладалі, нарэшце адбудзецца і прынясе пэўную карысць. У пятніцу, канешне, аб'ектыўных цяжкасцяў не пазбегнуць, але вам будзе пад сілу рашэнне бягучых задач і жыццёвых праблем. Але не варта чакаць у гэты дзень асаблівых поспехаў ад камандзіровак, перамоў і выступленняў. У нядзелю праявіце разумную эканомію ў справах, звязаных з энергетычнымі затратамі.

**ШАЛІ**. Лёс можа падарыць вам прыемныя знаёмствы, якія, калі і не адыграюць яркай ролі ў асабістым жыцці, то абавязкова дапамогуць у справах. Будзьце больш асцярожнымі пры прыняцці рашэнняў — самападман здольны згуляць з вамі злы жарт. Спрыяльны час для паляпшэння адносінаў з начальствам ці паступлення на новую работу. Чацвер — добры дзень для публічных выступленняў. У пятніцу вакол вас могуць кіпець сапраўдныя страсці — пастарайцеся захоўваць спакой. Нядзеля можа стаць супярэчлівым днём.

**СКАРПІЁН**. З'явяцца задумы новых праектаў, жаданне і магчымасць іх ажыццявіць — толькі не забывайце пра разумную асцярожнасць. Каб умацаваць бюджэт і пашырыць далягляд, прымайце ўдзел у сур'ёзных камерцыйных праектах. Невялікае бязладдзе ў рэшце рэшт пойдзе вам на карысць, калі накіруеце падзеі ў пазітыўны выток. Аўторак можа аказацца спрыяльным днём для звароту з просьбамі да начальства. У чацвер вучыцеся, зносьцеся і ўзбагачайцеся новымі карыснымі сувязямі. У нядзелю пастарайцеся прыйсці да адзінага меркавання з блізкімі людзьмі.

**СТРАЛЕЦ**. Тыдзень прынясе адчуванне ўнутранай свабоды. Актыўна рухайцеся да вызначанай мэты — партнёры дапамогуць і падтрымаюць вас. Калі ўсё вырашылі і прадумалі, то тыдзень спрыяльны для змены месца працы. У аўторак не бярыцеся за некалькі спраў адразу: гэта ноша можа быць вам не пад сілу. Чацвер, верагодна, засмуціць вас дробным бязладдзем у галіне дзелавых перамоў, аднак не варта паддавацца эмоцыям. У другой палове тыдня дзецям спатрэбіцца пільная ўвага. У выхадныя можа ўзнікнуць праблема выбару, напрыклад, паміж заробкам і адпачынкам.

**КАЗЯРОГ**. Цалкам верагодна, што вам давядзецца з галавой акунуцца не ў сваю справу. Падрыхтуйцеся да таго, што давядзецца абараняць свае правы і тлумачыць, што вы наогул тут робіце. Верагодныя творчыя азарэнні, таму прыслухайцеся да голасу сваёй інтуіцыі. Панядзелак спрыяльны для назапашвання інфармацыі і кантактаў. Аўторак — для спраў сур'ёзных, серада — для дыспутаў. У пятніцу пастарайцеся завяршыць большую частку пачатых спраў.

**ВАДАЛЕЙ**. Найвышэйшую каштоўнасць для вас будзе мець час. Галоўнае — ні пра што не забывайце, інакш не зможаце завяршыць усё, што запланавалі. А запланавана будзе нямала. На рабоце пастарайцеся быць больш стрыманымі: вы будзеце прадметам абмеркавання сярод калег — навошта даваць ім дадатковую падставу для плётак. Другая палова тыдня спрыяльная для рэарганізацыі і пашырэння асабістай справы. Падарожжа, якое пачнецца ў чацвер, можа атрымацца на рэдкасць удалым. У другой палове тыдня пажадана захоўваць разумную ўмеранасць у справах і жаданнях. Адзін з выхадных дзён давядзецца прысвяціць вырашэнню бытавых праблем.

**РЫБЫ**. У панядзелак пастарайцеся не ўвязвацца ў авантуры, бо ёсць вельмі вялікая рызыка вялікіх страт. Аўторак і серада могуць аказацца самымі складанымі днямі тыдня. Пятніца абнадзеіць своечасовай дапамогай сяброў. У суботу можна хутка і рашуча разабрацца з усімі пытаннямі, якія ўзнікаюць. Звярніце ўвагу на натхненне, якое ў вас узнікае, і як мага больш беражліва аднясіцеся да яго — яно жыватворна адаб'ецца на вашай дзейнасці. Пастарайцеся не мітусіцца.

# ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

РАІЦЬ ПСІХОЛАГ

## Поспехі дзяцей — у руках бацькоў



**Усе бацькі хочуць, каб іх дзеці сталі разумнымі, самадастатковымі і ўпэўненымі. Аднак яны не заўсёды надаюць значэнне сваім словам і ўчынкам ад якіх, між іншым, прама залежыць, якім вырасце дзіця. Часта выпадкова сказаныя словы ператвараюцца ў своеасаблівую праграму, якая можа сур'ёзна ўскладніць маленькаму чалавеку жыццё. Як гэтага пазбегнуць?**

**«ТЫ МНЕ НЕ ПАТРЭБНЫ»**

Здараецца, у парыве гневу з бацькоўскіх вуснаў злятаюць словы: «Мне не патрэбны такі (-ая) дрэнны (-ая) сын (дачка)», «Знікні з маіх вачэй прэч!». Супакоіўшыся, дарослыя хутка забываюць аб іх, а ў дзіцяці ў падсвядомасці застаецца ўяўленне аб уласнай нікчэмнасці і непатрэбнасці самым блізкім людзям.

Не кажыце дзіцяці, колькі бяссонных начэй вы правялі пасля яго нараджэння і чаго вы пазбавіліся ў жыцці дзеля яго, інакш яно будзе зведваць пастаяннае адчуванне віны і вырашыць, што лепш, каб яго зусім не было. Фактычна падсвядомасць запускае так званы «ген самаразбурэння», што амаль заўсёды выклікае цягу да алкаголю і наркотыкаў.

**«ВЫРАСТАЙ ХУТЧЭЙ»**

Часта бацькі, асабліва калі ў сям'і з'яўляецца другое дзіця, пачынаюць 5—6-гадовых малых лічыць дарослымі: «Ты ўжо не маленькі, каб так сябе паводзіць», «Ты старэйшы, таму павінен...». У дзіцяці з'яўляецца адчуванне, што трэба хутчэй вырасці, каб адпавядаць патрабаванням дарослых. У яго падсвядомасці трывала ўкараняецца думка: быць дзіцем — дрэнна. Такім дзецям потым вельмі цяжка знаходзіць агульную мову з уласнымі нашчадкамі.

**«НАВОШТА ДУМАЦЬ?»**

Многія бацькі не толькі не прыслухоўваюцца да думкі свайго дзіцяці, але і зусім перарываюць яго разважанні на любую тэму словамі: «Менш балбачы, больш рабі!», «Ты што, самы разумны?». І дзіця перастае дзяліцца з імі сваімі думкамі, а потым і аб нечым сур'ёзна задумвацца. Тым самым бацькі перашкаджаюць развіццю інтэлекту і аналітычнаму складу розуму ў малога. Такія дзеці з цяжкасцю прымаюць рашэнні, робяць неабдуманыя ўчынкі.

**«БУДЗЬ ЯК УСЕ»**

Мамы і таты, якія заглушаюць ініцыятыву дзіцяці, не даюць яму выдзеліцца ў дзіцячым калектыве, занепакоеныя пачуццём зайздрасці, што можа ўзнікнуць у іншых людзей у адносінах да іх дзіцяці, ці магчымымі праблемамі з-за яго празмернай актыўнасці. «Не высоўвайся!» — вось іх дэвіз. Аднак яны не разумеюць, што падобнай устаноўкай асуджаюць дзіця ў будучым займаць толькі падпарадкавальнае становішча ў грамадстве. Заахвочвайце актыўнасць дзіцяці ва ўсіх сферах, няхай яно паспрабуе сябе ва ўсім, што яму цікава. Так яно вырасце рознабаковым, эрудзіраваным і самастойным.

**«СТАНЬ ІНШЫМ»**

Іншы раз бацькі незадаволеныя дзіцем з самага нараджэння, напрыклад, калі чакалі сына, а нарадзілася дачка. У гэтым выпадку яго пастаянна параўноўваюць з Ванем, які больш паслухмяны, ці з больш акуратнай Насцяй. Тым самым яны адвяргаюць сваё дзіця як індывідуальнасць і не дазваляюць яму быць такім, якое яно ёсць. Калі малое вырасце, то будзе знаходзіцца ў пастаянным канфлікце з сабою, што можа прывесці да дэпрэсіі.

-2380-

ВАРТА ПРЫСЛУХАЦЦА

## Асаблівасці нацыянальнай кухні

Вучоныя, якія працуюць над стварэннем вакцыны ад птушынага грыпу, лічаць, што імунітэт можна ўзмацніць пры дапамозе традыцыйнага прадукту — квашанай капусты. Урачы рэкамендуюць есці гэту страву ў вялікай колькасці. А калі дадаць у капусту часнок, рэдзьку, цыбулю, крыху чырвонага перцу, вітамінізацыя будзе поўнай.

КУХОННЫЯ ДРОБЯЗІ

## Тэрмас любіць чысціню

**Звычайна мы выкарыстоўваем тэрмас, калі хочам мець пад рукой загадзя прыгатаваныя гарачыя стравы. Аднак ці захоўваецца пры гэтым якасць ежы? Герметычнасць і здольнасць захоўваць цяпло — тое, за што асабліва цэніцца тэрмас, паварочваецца іншы раз непажаданымі вынікамі. Чаму так адбываецца?**



Пры тых умовах захоўвання, якія ствараюцца для прадуктаў у тэрмасе, лягчэй размнажаюцца мікробы. Таму, перад тым як наліваць у тэрмас супы, кісялі, кампоты, каву ці какаву з малаком, іх трэба давесці да кіпення і ні ў якім разе не астуджваць у каструлі з адчыненай накрыўкай. Адразу пераліце вадкасць у тэрмас.

Што датычыцца страў з мяса, рыбы і агародніны, то неабходна прасачыць за тым, ці добра яны прасмажаныя і пратушаныя.

Яшчэ тэрмас выкарыстоўваюць у якасці своеасаблівай міні-пліты: для давядзення да гатоўнасці страў, для заварвання чаю, кавы. Аднак усё ж кашы, напрыклад грэцкую, у тэрмасе гатаваць не рэкамендуецца.

Самае стараннае мыццё і нават прасмажванне круп не гарантуюць стэрыльнасці — яна дасягаецца толькі працяглым кіпячэннем. Калі вы вырашылі атрымаць у тэрмасе сапраўднае адтопленае малако, пераліце яго ў тэрмас адразу ж пасля закіпання.

**НАСТОІ І АДВАРЫ**

Ці можна заварваць у тэрмасе лекавыя расліны? Адназначнага адказу спецыялісты не даюць. Калі гаспадыня ўпэўнена ў чысціні пладоў шыпшыны, чарнасліву, маліны, то іх можна настойваць у тэрмасе. Лекавыя ж травы больш патрабавальныя: некаторыя з іх проста заліваюць кіпенем, іншыя гадзінамі гатуюць і доўга настойваюць.

Невыкананне гэтых правілаў можа прывесці да нейтралізацыі карысных уласцівасцяў раслін і нават да з'яўлення ў настоях шкодных рэчываў. Таму лекавыя травы лепш усё ж гатаваць на пліце. Асноўная ўмова прыгатавання ў тэрмасе — стэрыльная чысціня!

КРУПІНКІ КЕМЛІВАСЦІ

## Насадка для пыласоса

Прапануем папоўніць арсенал насадак для пыласоса яшчэ адной. Кавалак веласіпеднай камеры, надзеты непасрэдна на металічную трубу, дапаможа ачысціць цяжкадаступныя шчыліны і вуглы, рэльефныя паверхні, а заадно і засцеражэ паверхні ад драпін.

-2381-

Іх шанавалі продкі

# ДАЖБОГ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 13, 16—19 студзеня.)*

З «Аповесці мінулых гадоў» вядома, што ў 979 годзе кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч зладзіў непадалёк ад свайго палаца вялікае капішча. Яго назвалі Пантэонам Уладзіміра. Сюды сабралі выявы ўсіх язычніцкіх багоў, якія знаходзіліся ў святых дубровах. У самым цэнтры, пад засенню свяшчэннага дуба паставілі драўляную выяву Перуна, які здаўна лічыўся ў нашых продкаў галоўным богам. Сярод шанаваных багоў асаблівае месца займаў Дажбог, выява якога таксама знаходзілася ў Пантэоне Уладзіміра. Быў ён сынам Сварога і ўнукам Вялеса. Таму назвалі часам Сварожычам.

Многія даследчыкі лічылі Даж-бога богам Сонца, ягоным светлым увасабленнем, таму і клікалі часта «Сонца-цар». А само Сонца заўсёды найбольш падабалася славянам наогул і нашым далёкім продкам таксама. Людзі разумелі, што ад яго залежаў лёс усяго жывога, яно было крыніцай жыцця. Калі Сонца з'яўлялася на небе, чалавек радаваўся, адчуваў сябе бадзёра, бо разам з цяплом і святлом усё навокал адраджалася, ажывала. Калі ж Сонца заходзіла альбо хавалася за хмары, чалавека апаноўвала трывога: ці вернецца нябесны жыццядаўца зноў, ці прадоўжыць сваё панаванне жыццё? Мо любоў да Сонца і ягонага цяпла пераўвасобілася пазней у пакланенне агню наогул? Людзі лічылі агонь вечным — нязводным і непагасным.

За сонечную дабрыню і шчодрасць, а мо каб задобрыць яго, Сонца называлі святым, светлым, праведным. Лічылі самым добрым і справядлівым, надзейным абаронцам пакрыўджаных і слабых. На яго ніколі нельга было паказваць пальцам. А паколькі культ Сонца быў такім высокім, то і ўсё, што звязана з ім, таксама мела вялікую значнасць і асаблівую каштоўнасць. Некаторыя даследчыкі нават сэнс слова «славянін» тлумачылі як «нашчадак Сонца» альбо «той, хто паходзіць ад Сонца».

Існуе меркаванне, што Дажбог з'яўляецца родапачынальнікам усходніх славян, іхнім апекуном, а ўсе гэтыя народы — унукі Сонца. Нават невядомы аўтар «Слова пра паход Ігараў» прытрымліваўся гэтага погляду і называў усходніх славян Дажбогавымі ўнукамі. Дык мо гэты слаўны і славуты бог і сапраўды з'яўляецца тым міфічным родапачынальнікам і нас, беларусаў, мо ад яго ўсе мы і пайшлі? У некаторых народаў сустракаліся імёны людзей, падобныя на Дажбога.

Паходжанне імя гэтага незвычайнага бога неабходна выводзіць не ад слова «дождж», хоць яны і блізкія па гучанню. Дажбог — гэта бог, які дае, гэта даравальнік усіх даброт. А што для селяніна магло быць важнейшым за дабрадзейнае цяпло ды жыватворнае святло? Мо таму дагэтуль сярод людзей жыве ўстойлівы выраз, у якім гучыць надзея на спагадлівасць і дапамогу вышэйшай сілы: «Дай Бог...» Калісьці, у глыбокай старажытнасці, слова «дай» гучала як «дажь», таму па-руску імя гэтага бога дагэтуль прамаўляецца як Дажьбог, Даждьбог.

Паколькі Дажбог — бог Сонца, то яго ўяўлялі прыгожым і дужым юнаком. Ён меў дзіўныя сонечна-залатыя валасы. Яны шырока і вольна развяваліся на крылах спадарожнага ветру, дадаючы яшчэ большай вабнасці дужацеламу юнаку. Нябесна-блакітныя вочы Дажбога заўсёды пазіралі прама, без фальшу, нікога не падманвалі. Таму і між людзьмі Дажбог таксама не любіў падману.

Надзвычай велічным быў ён у сваёй хадзе. Калі абыходзіў дазорам свае нябесныя і зямныя ўладанні, нельга было адвесці вачэй. Аднак найбольш любіў ён ездзіць, ці, калі казаць праўду, проста лётаць на прыгожай калясніцы, запрэжанай чацвёркай беласнежных коней. Грывы ў прыгожых коней вогненныя, крылы залатыя, а на ветры пышнай наміткай развяваюцца сонечна-залатыя Дажбогавы валасы.

У руцэ сонечны бог трымае рытуальны жэзл у выглядзе лісцяў папараці. Мо сабраў іх чароўнай Купальскай ноччу ў запаветных беларускіх барах? Лічылася, што сонечнае святло зыходзіць ад вялізнага вогненнага шчыта, які Дажбог заўсёды возіць з сабой. Святло гэтае пранікае ў самыя цёмныя з найцямнейшых лясныя гушчары, асвятляе самыя глыбокія з найглыбейшых марскія і азёрныя воды, зіхоткімі светлячкамі іскрыцца на расістай траве.

Многія паданні звязваюць Дажбога з вадой. Кажуць, што ён меў сваю ладдзю. Двойчы за суткі перасякаў на ёй мора-акіян. Адбывалася гэта светлай ранічкай і вечаровым сутоннем. А ладдзю тую цягнулі па вадзе гусі з лебедзямі ды качкамі. У фальклоры захаваўся міф пра жаніцьбу Дажбога з Ладай, адна з іпастасяў якой — марская царэўна. Дажбог прыкмеціў прыгожую Ладу з неба. Яе краса запаліла моцнае каханне. Ведама — каса залатая. На залатой лодцы ездзіць па моры. Вяслуе сярэбраным вяслом. А калі гарэзуе, то плюхае ім так, што пырскі ажно да Дажбога далятаюць. Аднак ягонаму каханню перашкаджае суровы бацька Лады. Калі Дажбог паехаў да яго, каб папрасіць рукі Лады, бацька не толькі не згадзіўся, а нават пабіў госця. Аднак Дажбог паправіўся і абхітрыў Ладу, якая, як і кожная жанчына, любіла ўсё прыгожае. Слуга Дажбога разаслаў на беразе мора такія дзівосныя ўборы, што Лада не стрымалася і выйшла на бераг. Там яе ўкралі для Дажбога.

Бога святла, цяпла, пладавітасці, а значыць, шчасця, людзі моцна любілі як сапраўднага рыцара святла і праўды. Дажбог і сам любіў падабацца людзям, таму не шкадаваў для іх сваіх добрых спраў. Вясной ён пасылаў на зямлю цудаспеўнага салавейку з наказам, каб той замкнуў зіму і адамкнуў лета, выпусціў на волю цяпло.

Вера ў гэтага добрага бога была такой моцнай, што людзі не сумняваліся: ён дапаможа ім у любой бядзе, выручыць заўсёды і ўсюды, дзе б яны ні знаходзіліся — у дзённым свеце ці ў начным. Бывала, шкадаўлівы Дажбог адпускаў са свайго нябеснага царства тых, хто рана і заўчасна памёр. Аднак для людзей яны заставаліся нябачнымі. У такім выглядзе з'яўляліся ў родных мясцінах, каб паглядзець на сваіх дзяцей і ўнукаў. Дажбогаў дзень альбо Вялік-дзень раней святкавалі ўвесну, акурат на цяперашні Вялікдзень — хрысціянскую Пасху. Гэтае старажытнае свята ў гонар Сонца, вясны, абуджэння прыроды і пачатку земляробчых клопатаў мела ў людзей вялікую пашану.

Нашы далёкія продкі, Дажбогавы ўнукі, верылі, што іхні апякун прысутнічае на ўсіх вяселлях. Ранняй-ранічкай шлюбнага дня ён з першымі сонечнымі прамянямі сустракае жаніха паміж трох дарог і вядзе яго да сваёй абранніцы.

**Анатоль БУТЭВІЧ.**





Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

### ПАСАЖЫРЫ ЗАДАВОЛЕНЫ

Аўтобусны парк Гомеля ў 2006 годзе папоўніўся 43 новымі машынамі. Цяпер на гарадскіх перавозках задзейнічана 25 працэнтаў новых аўтобусаў МАЗ вялікай і асабліва вялікай умяшчальнасці. Гамяльчанам прыемна было даведацца, што за ўсю 45-гадовую гісторыю існавання адразу 27 новых тралейбусаў прыняло ў 2006 годзе камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Гарэлектратранспарт».

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

*Любыя нашы **Марыя Іосіфаўна** і **Мікалай Вікенцьевіч ШЫХАТ,** якія ў добрым здароўі жывуць у в. Сакуны Ляхавіцкага раёна. Мы, вашы дзеці, унукі і праўнукі, шчыра віншуем вас з 60-годдзем сумеснага жыцця.*

*Аднаго просім мы ў Бога:*
*Каб вясёлай песняй*
*быў ваш лёс,*
*Каб пражыць гадоў*
*вам гэтак многа,*
*Колькі зорак*
*на ручніку нябёс.*

### ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**СКАНВОРД (13 студзеня). Па гарызанталі:** Трактарыст. Галіна. Лінкор. Артышок. Атака. Аймак. Марс. Бекар. Булат. Мята. Каралі. Рэндзю. Статак. Рот. Поні. Завала. Абадан. Шыла. Пас. Дакука. Краса. Канва. Ава. Панда. Банда. Сухарукаў. **Па вертыкалі:** Закуска. Табар. Апала. Актод. Шакал. Анапа. Гало. Іткіна. Ікар. Скапа. Рулон. Аванс. Кума. Нанду. Сянно. Дах. Рак. Акр. Задача. Эра. Самум. Век. Каляндра. Карат. Золак. Станюта. Аладаў.

## Сёння

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.15 | 16.26 | 8.11 |
| Віцебск — | 8.10 | 16.10 | 8.00 |
| Магілёў — | 8.05 | 16.16 | 8.11 |
| Гомель — | 7.55 | 16.20 | 8.25 |
| Гродна — | 8.29 | 16.43 | 8.14 |
| Брэст — | 8.22 | 16.50 | 8.28 |

**Месяц**

*Маладзік.*
*Месяц у сузор'і Вадалея.*

**Імяніны**

**Пр.** *Іаана Хрысціцеля .*
**К.** *Людмілы, Мілы, Люцыяна, Себасцьяна, Фабіяна.*

## Надвор'е на заўтра





Няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў

## 20 студзеня

Дзве даты



**1892 год** — нарадзіўся Браніслаў Тарашкевіч, беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, філолаг, літаратар, акадэмік Беларускай АН. Аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ». Пераклаў на беларускую мову «Іліяду» Гамера і «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Таварыства беларускай школы. З'яўляючыся дэпутатам польскага сейма, абараняў сацыяльныя і нацыянальныя інтарэсы працоўных Заходняй Беларусі. У 1937 годзе арыштаваны савецкімі ўладамі, у 1938-м — расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957-м.

**1920 год** — нарадзіўся Федэрыка Феліні, славуты італьянскі кінарэжысёр.

Цытата дня:

***«Пазбягаць сутыкненняў мужу з жонкай і жонцы з мужам трэба ўсюды і заўсёды, але найперш — у ложку: сваркам, лаянкам і ўзаемным знявагам, зробленым у ложку, асабліва нялёгка пакласці канец у іншым месцы і ў іншы час».***

**Плутарх (46—122), старажытнагрэчаскі пісьменнік і філосаф.**

## ...у суседзяў

| Горад | Тэмпература | Надвор'е |
|---|---|---|
| ВАРШАВА | +5 — +7 °C | Без ападкаў |
| ВІЛЬНЮС | 0 — +2 °C | |
| КІЕЎ | +9 — +11 °C | |
| МАСКВА | -1 — +1 °C | |
| РЫГА | +3 — +5 °C | |
| С-ПЕЦЯРБУРГ | -5 — -3 °C | |

# ЗІМОВЫ ЎЛІК ПТУШАК У СТУДЗЕНІ

Вельмі папулярнымі робяцца ў нашай краіне назіранні за птушкамі. Такія захапленні крылатым царствам сталі своеасаблівым «паляваннем» за відамі птушак. Асноўная мэта такіх мерапрыемстваў — вызначэнне і фіксаванне найбольшай колькасці дзікіх птушак. Хутка мы даведаемся аб тым, як моцна адбілася незвычайна цёплая зіма на стане крылатай фауны краіны. Зараз у краіне пачынаецца зімовы ўлік птушак.

Паводле слоў спецыяліста па экалагічнай адукацыі грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ) Руслана Шайкіна, ёсць віды птушак, за якімі лягчэй назіраць менавіта ў зімовы перыяд. Напрыклад, усім нам добра вядомыя снегіры ў цёплы сезон гняздуюцца ў беларускіх лясах. Але ці часта мы іх бачым летам?

Скрытыя і нешматлікія ў летні перыяд мініяцюрныя і сімпатычныя сініцы-апалоўнікі. Апалоўнікі знаходзяцца ў далёкім сваяцтве з больш вядомымі відамі — вялікай сініцай, князьком і бураголовай сініцай. У зімовы перыяд усе гэтыя птушкі аб'ядноўваюцца ў вялікія чароды, дзе з прыемным «стракатаннем» лётаюць па садах і парках. Менавіта ў халоднае надвор'е апалоўнікаў можна ўбачыць нават у вялікіх гарадах нашай краіны.

Асобных прыгожых і цікавых птушак мы можам назіраць увогуле толькі зімой. У першую чаргу гэта «прыгожа апранутая» амялушка. З боку таежных лясоў пагрэцца да нас прылятае зімой маленькая попельная чачотка. Велічны драпежнік касматаногі канюк — пагроза дробных грызуноў і птушак — залятае да нас са Скандынавіі.

Зімовы ўлік птушак стаў ужо традыцыйнай формай вывучэння стану «крылатага насельніцтва» роднага краю ў зімовы перыяд. Назіранне за птушкамі ў халодны перыяд мае свае перавагі для пачынаючых аматараў прыроды, бо зімой птушак менш, яны трымаюцца чародамі, прылятаюць да кармушкі і таму іх лёгка разгледзець.

У зімовым уліку птушак можа ўзяць удзел кожны. Для гэтага трэба заказаць спецыяльную анкету з відамі птушак у грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны», а ў адзін са студзеньскіх дзён выйсці на прыроду і пералічыць усіх птушак, якія сустрэнуцца. Вынікі сваіх назіранняў можна перадаць па тэлефоне АПБ (017) 263-01-30 або даслаць анкету па адрасу: а/с 306 220050 Мінск або па электроннай пошце E-mail:apb pr@tut.by

**Сяргей КУРКАЧ.**



ПаWWWуцінне ад Вікторыі Захаравай

## «Windows» стане беларускай

**Сёлета ў чэрвені чакаецца з'яўленне беларускамоўнай версіі, бадай, самага папулярнага ў свеце праграмнага забеспячэння — «Windows». Гэту інфармацыю пацвердзілі прадстаўнікі кампаніі «Microsoft» у Беларусі.**

Па шчырасці, беларускім будзе толькі інтэрфейс, так званая моўная абалонка — гэта дазволіць праграмам «размаўляць» з карыстальнікам па-беларуску. Куды больш важна, як лічаць спецыялісты, цалкам забяспечыць арфаграфічную падтрымку «Windows». Праўда, дагэтуль невядома, наколькі запатрабаваным стане новы прадукт — усё ж такі большасць карыстальнікаў на постсавецкай прасторы, у тым ліку ў Беларусі, працуе зусім не з ліцэнзійнымі, а з пірацкімі версіямі праграмнага забеспячэння.

# Міжнародны клуб ЗВЯЗДА

## Што пакажуць лютаўскія «Аграпрэм'еры»?

Новы выставачны праект — міжнародны кірмаш сродкаў механізацыі сельскай гаспадаркі «POLAGRA-Аграпрэм'еры» — будзе праходзіць у польскім горадзе Познань з 23 па 25 лютага гэтага года.

У рамках гэтага дзелавога форуму будуць шырока прадстаўлены сельгастэхніка, машыны і абсталяванне для сельскагаспадарчай вытворчасці, а таксама разнастайныя гатункі насення зерневых, алейных, струкавых, прапашных культур. У праграме кірмашу — прэзентацыі навінак аграпрамысловага комплексу, сельскагаспадарчага рынку і форум вытворцаў зерневых культур.

Наведаць «POLAGRA-Аграпрэм'еры» зацікаўленыя беларускія кампаніі могуць у складзе дэлегацыі Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў, якая цяпер камплектуецца. А падрабязную інфармацыю аб самім кірмашы можна даведацца ў Інфармацыйным бюро «Міжнародных познанскіх кірмашоў» у Беларусі: (017) 298-37-31, 298-24-46.

**Барыс ЗАЛЕСКІ, дырэктар РІА «Міжнародны клуб».**

## НАШ ПАРТНЁР— ПОЛЬШЧА

Работа в Польше

Огородное хозяйство примет на работу женщину для сезонной работы в оранжерее.

Дополнительная информация по телефону: (8-10-48-662) 379-860, с 18 до 21 часа.

После получения телефона для контакта через SMS, e-mail или почтой обязательно свяжемся

Наш адрес: Огородное хозяйство -- "ТОМАТО JTM"
Janow 14, 05-480 Karczew, Polska / Польша.
E-mail:info@tomatojtm.pl Http://www.tomatojtm.pl
Факс: 8-10-48-7808408.

Работаем через агентства Беларуси соответствующего профиля, имеющие необходимые разрешения и лицензии.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, А. МЯСНІКОЎ, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19; аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.

html: www.zvyazda.minsk.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 37.095. Індэкс 63850. Зак. № 384. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12